ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 44 (426) Нядзеля, 17 красавіка 1927 г. || Выходзіць тры разы на тыдню у сераду, пятніцу і нядзелю || Год выд. VII. || Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. || Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“. Менск, Комсам. 25.

Здрадніцтва.

Белагвардзейскі пераварот у Шанхаі.

По згаджэньню з чужаземцамі, Чан-Кай-Ші стварыў пераварот у Шанхаі, распусьціў Шанхайскі ўрад. Яго генэралы разброілі рабочыя дружыны і растралялі па загаду чужаземных гвалтаўнікоў сотні пролетарыяў, пролетарскіх жанчын і дзяцей.

Рабочы кляс усіх краін, прыгнечаныя ўсіх народаў павінны бачыць, што ў Кітаі адыходзіць ад барацьбы з імпэрыялізмам кітайская буржуазія, напужаная магутна-гіганцкай хваляй рабочага і сялянскага руху.

Гэты рух ахапляе такі акіян чалавецтва, што ніякія сілы ня змогуць задушыць кітайскую рэволюцыю.

Міжнародны дзіцячы тыдзень.

Пяцігодзе піонэрскай організацыі.

У гэтым годзе міжнародны дзіцячы тыдзень будзе праводзіцца з 15 па 22 мая, разам з пяцігодзьдзем існаваньня піонэрскай організацыі усяго Савецкага Саюзу.

По рашэньню бюро ЦК ЛКСМБ да гэтага сьвяткаваньня таксама прыўрачваецца і пяцігадовы юбілей піонэрскай організацыі Беларусі.

Правядзеньню сьвяткаваньня надаецца вялікая значнасьць. Тыдзень і пяцігадовы юбілей павінны паслужыць яшчэ больш глыбачэйшаму замацаваньню распачатай працы па ажыўленьню піонэрскай організацыі.

У дні сьвяткаваньня неабходна з'організаваць рад масавых мерапрыемстваў, як вогнішчы, маёўкі, масавыя гульні, карнавалы, выстаўкі па розным галінам піонэрскае і дзіцячае творчасьці.

Наш абавязак прадаставіць шырокую магчымасьць выяўленьню актыўнасьці і самадзейнасьці дзетвары. Іх запатрабаваньням для гэтага правесьці нарады з мэтай падрыхтоўкі да сьвяткаваньня, павадыроў атрадаў, старэйшых піонэраў.

У сьвяткаваньне неабходна шырока ўцягнуць школы, настаўніцтва і другія сілы.

У сьвяткаваньне шырока ўцягнуць комсамольскія організацыі і актыў, райработнікаў, работнікаў акруговых камітэтаў.

Асноўнымі задачамі сьвяткаваньня зьяўляюцца:

Інтэрнацыянальнае выхаваньне азнаёміць дзетвару з дзетрухам іншых краін, асабліва Кітаю і Польшчы, наладзіць перапіску з атрадамі розных краін, таварыскую сувязь паміж атрадамі розных нацыянальнасьцяў, зьнішчэньне антаганізму паміж дзецьмі, дзе ён ёсьць.

— Падвядзеньне вынікаў работы організацыі за ўвесь час існаваньня і за прашоўшую зімовую пару. Далейшае замацаваньне і пашырэньне працы атраду.

— Падрыхтоўка да летняе работы, як організацыя пляцовак, сбор грошай на лягеры, пашырэньне самадзейнасьці дзяцей, палепшэньне сельска-гаспадарчае працы у вясковых атрадах, натуралістычнай працы і іншае.

У час гэтага сьвяткаваньня неабходна распрацаваць заданьне аб падвядзеньні вынікаў зімовае працы, так каб атрад больш не займаўся многа кампанейскай работай, а паглыбляў сваю штодзённую работу.

Матар'ялы к сьвяткаваньню будуць зьмяшчацца ў друку.

М. Адзінец.

Настойліва і рашуча.

(Артыкул намесьніка наркома РСІ СССР т. Лебедзя).

Не паслабляць націску.

Было-б шкадлівым паслабляць масавую прапаганду і організацыю працоўных вакол барацьбы з бюрократызмам. Асобныя галасы, якія раздаюцца аб тым, што „многа шуму“ вакол справы барацьбы з бюрократызмам зьяўляюцца глыбока няверныя, бо пераможны бюрократызм мысьліма, як гэта ня раз указваў творца савецкай дзяржавы тав. Ленін толькі праз сталым масавым, непасрэдным удзеле і пад кантролем рабоча-сялянскіх мас.

У сучасны момант казаць аб маючыхся дасягненьнях яшчэ далёка загадзя, бо хоць яны ёсьць, але у параўнаньні з агромаднымі недахопамі, патрабуючымі яшчэ свайго зьнішчэньня, патолькі не значны, што ня могуць лясьці хаця-б колькі небудзь закончанага аблічу ўсёй пацімесячнай кампаніі барацьбы з бюрократызмам.

Зьнішчэньне паняровага засільля ў працы установ і павышэньне адказнасьці за жывое, своечасовае выкананьне ў працы, якое можа быць працаўнікам дасягнута, зьяўляецца адной з важных задач.

Валакіта ў справе абслугоўваньня патрэб сялянства адно з злосных скажэньняў, якое павінна быць адсечана як бы там ня было.

Неабходна партыйным, профэсыйным і комсамольскім органам нанесьці рашучую барацьбу з конкрэтным праяўленьнем валакіты і бюрократызму апарату ў яго абслугоўваньні працоўных мас.

Праз рацыяналізацыю да экономіі.

Комсамол мае шырокія магчымасьці дапамагчы партыі ў барацьбе з бюрократызмам.

У цэнтральных ведамствах, у нізавых організацыях праца ячэек УсеЛКСМ павінна быць пабудавана так, каб энтузыязм і энэргія кожнага комсамольца і ўсёй рабоча-сялянскай моладзі былі-б організаваны накіраваны на дапамогу ў барацьбе за танны, просты апарат у барацьбе з бюрократызмам.

Хіба апарату могуць перашкаджаны пры сумесным організаваным стараньні ячэек партыі, комсамольскіх ячэек, нізавых організацый профсаюзаў, вытворчых камісій і экономкомісій.

Барацьба за лепшы апарат ёсьць адначасова барацьба за экономію сродкаў, за вялікія намнажэньні сродкаў, на выкананьне програмы па індустрыялізацыі краіны. Таму і праца па рацыяналізацыі апарату не павінна быць адцягнутай, а сувора практычнай, даючай вынікі на сёньняшні дзень.

Зэкономіць дзесяткі мільёнаў рублёў у бліжэйшыя месяцы, адсячы лішнія награмаджэньні ў сыстэме організацыі апарату, адсякаць бюрократычныя скажэньні апарату і яго работнікаў—вось галоўнае на ўсёй кампаніі па барацьбе з бюрократызмам.

Не цыркулярам, а справай!

На 14-м зьезьдзе УсеКП, тав. Бухарын у дакладзе аб комсамоле, сказаў: „Цяпер комсамол перажывае вядомы крызыс росту: крызыс у агульным і цэлым выражаецца ў тым, што зьмест працы комсамольскіх організацый і мэтады гэтай працы ўжо цяпер знаходзяцца да вядомай ступені ў супярэчнасьці з тымі запатрабаваньнямі, якія юнацкія шэрагі складаюцца на грунце гаспадарчага росту; вельмі часта зьмест і мэтоды старога тыпу працы мэханічна пераносяцца на цяперашні час, ня ў поўнай меры ўлічваецца тое новае, тое спэцыфічнае, тое галоўнае, што высоўваецца іменна цяпер, у зьвязку з гаспадарчым ростам“.

Маючы перад сабою такія задачы, Бабруйскі Акругком і ўся організацыя прыняліся за практычную працу.

Зрабілі мы яшчэ вельмі мала, але калі падлічыць усе тыя пачынаньні, якія праведзены і пачынаюць разгортвацца ў штодзённай працы організацыі, дык гэта ёсьць вялікія посьпехі.

Вось,—гэтыя новыя мерапрыемствы нядаўна праведзеныя.

Нарады самастойных гаспадароў—пры вопытнай станцыі Турск, у Рагачоўскім раёне, райнарада ў Клічаўскім раёне.

Праведзены ў гэту зіму акруговы зьезд гарманістых які добра дапамог у нашай культурна-масавай працы і барацьбе з хуліганствам.

Добра падрыхтавана і праведзена паездка дэлегацыі на лінкор „Парыская Комуна“.

„Дні сялянскай моладзі“ ўжо прывіліся і пачалі разгортвацца на Бабруйшчыне.

Праведзеная нарада замужніх комсамолак па горорганізацыі дала магчымасьць больш прыстасаваць працу ячэек да ўцягненьня гэтых комсамолак ў працу ячэйкі.

Юнсэкцыяй пры заводзе „Чырвоны Харчавік“ праведзен конкурс на лепшага вучня—вытворчасьці.

Цэлы шэраг асобных гаспадарчых мерапрыемстваў: па коопэрацыйнай працы у горадзе і вёсцы Рагачоўскай організацыяй праведзен месячнік па коопэраваньні моладзі, які даў добрыя вынікі.

Асобныя мерапрыемствы па культурна-масавай працы, як: гарадзкая культурна-масавая конфэрэнцыя, конкурс організаваны юнсэкцыяй чыгуначнікаў ў Жлобіне на лепшага дэкламатара і сьпявака, рыне нарады гарманістых і г. д.

Распаўсюджваньне гэтага вопыту з кожным днём у організацыі пашыраецца, наступова крок за крокам зьмест работы пачынае прыстасоўвацца да здавальненьня запатрабаваньняў рабоча-сялянскай моладзі.

М. Хількевіч.

Кулю--у медны лоб бюрократызму!

Вакол барацьбы з бюрократызмам аб'яднаем шырокія масы моладзі

Змагаючыся за палепшаньне дзяржапарату мы змагаемся за социялізм

Мы зварочваем увагу органаў РСІ на факты бюрократызму, якія асьвятляюцца сёньня ў газэце

Внучка--за бабку, бабка--за дзедку, дзедка...

і выцягнем рэпку протэкцыянізму!

Т. Віленстовіч—нам. Наркома РСІ БССР—аб протэкцыянізме

Даклад на сходзе працаўнікоў друку.

Што гэта такое—протэкцыянізм?

* * *

Салідная паважаная ўстанова дае атэстацыю нейкаму чалавеку:

— Такі вось чалавек трымаў краму, займаўся контрабандай, потым ён меў рэстаранчык, дзе нелегальна гандляваў гарэлкай, прывабліваў у гэты прытон проститутак, займаўся самагонакурэньнем“... і г. д.

Словам—фрукт, як трэба. Хоць направляй без перасадак у „штаб Духоніна“.

Але думкі бываюць розныя.

Другая ўстанова дае вышэйпаказанаму крымінальнаму тыпу такую характарыстыку:

— Надзвычайны працаўнік. Непараўнальны організатар. Бездакорнае мінулае—стары чырвонагвардзеец... з падчыненымі строгі—але падчыненымі любімы. Вясёлага розуму. Ня п'е, у карты ня гуляе. Жыве скромна. Становішча здароўя добрае. **У палітычных адносінах упаўне лояльны з прыкметнымі сымпатыямі да Савецкай улады...“**

У тым-жа справа? Хто-ж хлусіць?

Дагадайцеся самі...

* * *

ЦСУ. Гэта значыцца Цэнтральнае Статыстычнае Упраўленьне. Буйнейшая ўстанова з правамі народнага камісарыяту.

Вы ведаеце што здарылася ў гэтым самым ЦСУ?

Рэвізія выкрыла, што гэта ўстанова амаль што **на палову была ўкомплектавана з родзічаў**. Муж прымаў жонку, жонку цягнула цешчу; брат **прыстрайваў сястру, словам—увучка за бабку, бабка за дзедку, дзедка за рэпку...**

І вось зараз усю гэтую **крамачку** выкрылі і сталі дакапвацца. І сталі высьвятляць. І знайшлі што:

Папершае ў ЦСУ служыў дзянікінскі афіцэр.

Падругое ў ЦСУ служыў бышы работнік аддзелу браявых частак арміі генэрала Врангеля.

Характэрна, што ўсе гэтыя „генэралы“ цешчы, сваты і сваякі ўстрайваліся „па закону“. Праз Біржу Працы.

Скора будзе апублікавана, распараджэньне аб звальненьні там 22 чалавек.

Гэта толькі пачатак.

* * *

Адказны працаўнік займае пакойчык у беднай рабочай сям'і. У гэтай сям'і ёсьць хлапчук. Кончыў школу, хоча працаваць. Пачынаецца над'язджаньне к суседу:

— Ходзіць вось хлапчуга... Здольны малы... хоць бы яго **дармова** вучнем.

— Дармова? Ну, гэта пустая справа.

Хлапчук пачынае працаваць. Аказваецца сапраўды здольным. Яму назначаюць пэнсыю, уводзяць у штат...

Меў тут месца протэкцыянізм? Меў! Бязумоўна, меў...

* * *

Прадстаўніцтва. Іх у нас у Менску да чорту—каля 300. Большасьць іх, безумоўна, скрытая протэкцыя. Жаданьне даць работу „роднаму чалавечку“.

Ёсьць у нас прадстаўніцтвы, ад якіх сьлёзы на вачох навёртваюцца.

Прадстаўніцтва Чэрвеньскай друкарні.

А ў гэтай друкарні штат у 6 чалавек!

Ёсьць і такія „паўпрадствы“: штат 3 чалавекі. Разьмеркаваньне абавязкаў такое: папаша—ўпаўнаважаны, яго сынок—агент, а хатняя працаўніца—кур'ер. Папаша масловы гандляр. Ён акрамя працы па прадстаўніцтву (а можа быць і праз яго) робіць свае „дзялы“.

Нядаўна адно такое самойнае прадстаўніцтва было выкінута праз міліцыю.

* * *

Ёсьць яшчэ адзін від протэкцыянізму. Гэта так званы „ідэолёгічны“ протэкцыянізм.

У Глускай больніцы ёсьць такі ўрач—**Ерусалімскі** па прозьвішчу. Ад сваіх хворых, ад сялян, ад бедакоў ён бярэ „падарункі“ па 5-10 руб. Галоўным чынам за вборты. **Жонцы прокурора ён робіць аборт дармова.**

Прокурор—партыец становіцца ахвярай „ідэолёгічнага“ протэкцыянізму. Ён маўкліва пакрывае незаконныя дзеяньні **Ерусалімскага.**

* * *

А ўрэшце надыдзе канец протэкцыянізму!

Гр.

Аб людзях, сабацы і кані.

Мы чамусьці прызвычаіліся лаяць тых асоб, якія адносяцца да людзей, як да сабак і завем іх **бюрократамі**. Гэта ні на чым не абгрунтавана! Каб усякага роду «начальства» гэтак адносілася да сваіх падлеглых і прыватных асоб, як кіраўнік справамі МЦРК тав. **Прэсман** да свайго сабакі, усё было-б добра і нікому ня прышло-б у галаву праводзіць кампанію, якая завецца барацьбой з бюрократызмам.

Усім ахвярам матушкі валакіты, якія міласьцю бацюшкі бюрократызму прымушаны месяцамі чакаць ва ўстанове якой небудзь спраўкі, ці запаўняць анкеты даўжынёю ў 8 мэтраў, мы **можам** ад шчырага сэрца пажадаць бачыць да сябе такія чулыя таварыскія адносіны, якія сабака тав. **Прэсмана** бачыць ад свайго гаспадара.

Абкружаны клапотамі і ласкай гаспадара, памянёны сабака жыў сабе спакойна і, як кажуць, «гора-бяды ня знаў». Але аднойчы засумаваўшы чымусьці, ці проста захацеўшы падыхаць сьвежай паветрай, наш **Лыска** ня вытрымаў і, не паведаміўшы свайго ласкавага гаспадара, не пакінуўшы пасьля сябе ніякіх вестак, зьнік невядома куды.

Гора і сум тав. **Прэсмана** пасьля гэтага выпадку не паддаваліся апісаньню. Сэрца яго перапоўненае пяшчотай і каханьнем да сабакі рвалася на часткі, праца не ішла у галаву. Супрацоўнікі, бачучы у якім становішчы знаходзіцца паважны кіраўнік спраў, ня ведалі што і думаць...

Ня доўга думаючы, тав. **Прэсман кідае службовыя абавязкі, бярэ казённага каня з фурманам, якімі нават не карыстаюцца супрацоўнікі ЦРК у часе службовых патрэб, і едзе за горад шукаць прапаўшага сабаку. Бо, як кажуць,—«каханьне ня ведае перашкод».**

Прабылтаўшы невядома дзе некалькі гадзін, тав. **Прэсман** урачыста ўяжджаў у горад. Шуканьня яго скончыліся посьпехам! Віхаючыся трывогі ціха пакоіўся на каленах тав. **П.**, з ласкай і падзякай пазіраючы ў твар свайму гаспадару.

Толькі фурман, якога **патурбавалі** з-за такога ганаровага багажу, нешта злосна бурчаў сабе пад нос, ды конь-бядак ніяк зразумець ня мог, чаму сабаку такі гонар, чым ён, конь, горш за Лыскі?

* * *

Хто з нас не пазайздросьціць шчасьліваму лёсу сабакі кіраўніка спраў **МЦРК**. Вось і скардзіцеся пасьля гэтага на **сабачыя адносіны** да людзей!

Хмара.

Канцэлярыя пад мікраскопам.

Рэжам экономію, рэжам! Начальства «выхоўвае» супрацоўнікаў. Загад з «але».

Усяго... 190 рублёў.

Цэлы месяц агент адбіваў парогі Наркам Аховы здароўя, прапануючы апарат „апапограф“.

Нарашчы гэты апарат купіць. Чаму не? Ня дорага—**усяго... 190 рублеў.**

Купілі.

І што-ж? Ужо амаль паўгода, як апарат „апапограф“ стаіць запылены на шкафу ў агульнай канцэлярыі.

За ўвесь час апарат Наркам Аховы Здароўя **карыстаўся ім ня больш 2-х разоў.**

Каму гэта патрэбна?

„Чалавек“ і „вапчэ“.

— У нас „чалавек“ пачынаецца ад „зава“ —кажуць супрацоўнікі НКАЗ—астатнія гэта „вапчэ“.

Калі ў канцэлярыю зойдзе „заў“—дык ён толькі з „завам“ здароўваецца... Супрацоўнікі „не удостаиваются“ і кіўка галавой...

— Няма таварыскай спайкі паміж супрацоўнікамі—на вуліцы „заў“ ніколі не пазнае свайго служачага, не паздаровацца...

— Што-ж гэта такое?

— Гэта бюрократычныя замашкі—адказваюць.

Каб „начальства не прагневаць“.

Чамусьці ў Наркам Аховы Здароўя ў бухгалтэрыі заўсёды гарачка, рабочага часу не хапае. Амаль што кожны дзень к канцу заняткаў чуецца голас загадчыка грашовым аддзелам:

— Вы сёньня павінны прысьці вечарам папрацаваць!

Супрацоўнікі бухгалтэрыі не супярэчаць, наадварот баяцца супярэчыць і працуюць за 12-ці гадзін увечары.

Награнула аднойчы інспэкцыя працы. Хацела штрафу накласьці, але супрацоўнік грашовага аддзелу раней „інструктаваны“ завам адказаў:

— **Мы па свайму жаданьню... працуем.**

Інспэкцыя пашла.

Зараз заў куды вумней робіць: дае гэтую працу супрацоўнікам надому...

Баяцца супрацоўнікі **„прагневаць начальства“ (а можа яшчэ скарачэньне будзе?)**

Загад з „але“.

Надрукаваць паперку ў машынным аддзяленьні НКАЗ—справа цяжкая. Хаця машыністак тут 4, а парадку ніякага!

У адзін прыгожы дзень быў дадзен загад, у загадзе значылася:

Даваць працу машыністкам **мае права тольні загадчык канцэлярыі, але мае права даваць і загадчык оргаддзелу. Акрамя загадчыка канцэлярыі і заг. оргаддзелу маюць яшчэ права даваць працу і сакратар наркому і дзелавод оргаддзелу.**

І вось з раніцы загканц. нагружае усе машынкі. Прыходзіць дзелавод оргаддзелу.

— Выньце гэту працу і друкуйце мне.

Праз 10 хвілін прыходзіць сакратар наркому.

—Выньце гэту працу і друкуйце мне.

Праз 10 хвілін прыходзіць заг. оргаддзелу.

— Надрукуйце мне, а гэта можаце адкласьці.

Пасьля гэтага пачынаюцца лаянкі паміж загадчыкамі. Перагледжваюць загад і тлумачаць яго, як хто разумее.

А праца кульгае.

Дукоры пішуць...

Яшчэ ў мінулым годзе была апублікавана пастанова Саўнаркому БССР аб разьмеркаваньні ў ліку броні на ўстановах і прадпрыемствах падросткаў з дзіцячых дамоў.

Прышла чарга і за Белкопсаюзам. У распараджэньне гэтай установы было накіравана 20 дзяцей—былых выхаванцаў дзетдамоў. Да гонару Белкопсаюзу трэба сказаць, што апошні ні хвіліны не марудзіў, а адразу стаў клапаціцца аб разьмеркаваньні прысланых дзяцей па сваіх установах і філіялах.

Дукорскае спажывецкае таварыства апынулася ў ліку ўстаноў, прызначаных БКС для разьмеркаваньня падросткаў. Туды быў накіраваны у якасьці вучня-бронявіка, на падставе спэцыяльнай умовы, падростак з дзіцячага дому **Карасік**.

Атрымаўшы за навучаньне **Карасіка** спэцыяльнасьці прыказчыка 72 руб., пры ўмове штомесячнай выплаты яму, **Карасіку**, 12 руб. праўленьне Дукорскага спажывецкага таварыства задумала: „И капитал приобрести и невинность соблюсти“. **Задумала адсёлацца ад бронь-падростка.**

І вось ужо ляціць у Белкопсаюз паперка аб тым, што тав. **Карасік** „малапісьменны“, што „ён ня здольны да коопэрацыйнай працы“ і г. д. і г. д. Грунтуючыся на адносіне праўленьня Дукорскага спажывецкага таварыства, Белкопсаюз зьняў з працы тав. **Карасіка** і замяніў яго тав. **Сіцкінай**, пісьменнай і разьвітай дзяўчынай, скончыўшай коопэрацыйныя курсы. Гэта ўжо напэўна здолее вучыцца коопэрацыйнай справе, тут не адмовішся „няпісьменнасьцю і няздольнасьцю“.

Але праўленьне спажывецкага таварыства зусім інакш глядзіць на гэтую справу!

Зноў паляцела ў Белкопсаюз паперка аб тым, што „спажывецкае таварыства ад вучняў зусім адмаўляецца“, што „бронь наогул нам не патрэбна“, што „няма сродкаў на ўтрыманьне вучня“ (а куды дзеліся прысланыя Белкопсаюзам 72 руб.?) ды інш.

Ледзь не са сьлязьмі ўмаліла праўленьне таварыства Белкопсаюз аб „вызваленьні“ яе ад броні, а пакуль што, не чакаючы пастановы БКС, звольніла тав. Сіцкіну.

Зараз гэта справа разьбіраецца ў Менскім акруговым аддзеле працы. Трэба спадзявацца, што імкненьню Дукорскіх бюрократаў „вызваліцца ад броні“ будзе дадзен належны адпор і што тав. **Сіцкіна** будзе прынята зноў, а выплатай ёй за прагульны, не па яе віне, час.

Я. Зэльцар.

Як скарыстоўваем вольны час

Усебеларуская пераклічка вопытам працы.

Слова мае Бабруйская комсамолія і выклікае Гомель.

Політграмата і балалайка.

„Дзень Сялянскай моладзі".

Есьць ячэйкі, якія «дзень сялянскай моладзі» праводзяць добра, стала і здавальняюць ім запатрабаваньні моладзі. Іншыя ячэйкі праводзяць гэты «дзень» ня планава. Зьмяняюць яго у дзень скокаў, альбо зусім мала уводзяць увесялільна-карыснага моманту. Есьць ячэйкі, якія зусім не праводзяць гэтых «дзён».

Звычайна, для падрыхтоўкі «дню» вызначаецца камісія з прадстаўнікоў ячэйкі, з актыву моладзі. Практыка існаваньня гэтых камісій паказвае іх жыцьцёвасьць. Там, дзе яны стварaліся паляншаўся і зьмест «дню».

Ячэйкі прыцягваюць да правядзеньня «дню» і беспартыйную моладзь. Ячэйка Кашчалева ўцягнула 17 чалавек беспартыйнай моладзі у драмгурток. Гэты гурток існуе для дапамогі ў правядзеньні «дню сялянскай моладзі». Уцягнутыя зьяўляліся амаль што першымі хуліганамі і ад іх спакою ня было. Цяпер яны сябе трымаюць добра, граюць на сцэне, наводзяць парадак у клюбе.

«Як звычайна праводзіцца «дзень сялянскай моладзі»?

Сход адчыняе сакратар ячэйкі, альбо сябра бюро ячэйкі. Абіраецца прэзыдыум, ставіцца які небудзь даклад, напрыклад «Дзень ураджаю», «МЮД», аб сельска-гаспадарчым падатку, аб організацыі вячэрняй школы сялянскай моладзі. Даклад працягваецца 30-50 хвілін. Спрэчкі па дакладу невялічкія. Потым ставіцца спэктакль, 4-5 чалавек выступаюць з дэклямацыямі, 2—граюць на балалайцы, гітары. Потым танцы на сцэне, гульні, фанты, 6 агульных танцаў і ўсе.

Адзін з апошніх «днёў сялянскай моладзі» праведзены Клічаўскай ячэйкай у вёсцы Паплавы, зьмяшчаў у сябе наступнае: справаздача прадстаўніка ячэйкі аб працы сярод беспартыйнай моладзі - 15 хвілін, пытаньні, спрэчкі—25 хвілін, дэмонстраваньне дыапозытываў аб жыцьці політзьняволеных (праз ліхтар)—40 хвілін, спортвыступленьні піонэраў 20 хвілін. Потым дэкламацыя, комсамольскія прыпеўкі займалі 20 хвілін.

Праводзяцца і такія «дні сялянскай моладзі» (Коўча, Клічаўскага раёну), дзе для правядзеньня «дню» ячэйка высоўвае двух-трох комсамольцаў. Іх прымацоўваюць да тэй ці іншай вёскі, дзе яны склікаюць сходы моладзі. Звычайна, аўвестка дню такіх сходаў бывае: задачы Комсамолу ў вёсцы, аб МОПР'ы, справаздача лістаноўца, на гэтым і заканчваецца сход.

Недахопам у правядзеньні «дзён сялянскай моладзі» зьяўляецца адсутнічаньне матар'ялу. Але ўсё-ж такі «дзень» праводзіцца большасьцю комсамольскіх ячэек нашай акругі.

Ізакаў.

Юнсэкцыя да сябе прываблівае.

(Жлобін).

Ран'шнікі на нядзелях.

Уся культурна-масавая праца у нас праводзіцца праз юнсэкцыі. Па свайму зьместу і формах гэтая праца не здавальняла моладзь: «сухія» лекцыі, даклады пасьля настановак ужо надта абрыдзелі.

Пасьля абгаварэньня пытаньня на бюро райкому і на нарадзе актыву, мы некалькі зьмянілі форму працы і сталі праводзіць ранішнікі раз у тыдзень. Пачалі высоўваць пытаньні больш жыцьцёвыя: аб шлюбе (абгаварвалі мясцовы матар'ял, крытыкавалі тых ці іншых комсамольцаў, якія дрэнна жывуць з жонкамі), аб п'янстве, вытворчай дысцыпліне і г. д. Покуль што гэтыя ранішнікі цікавяць нашу моладзь.

Хто лепш адкажа на карыкатуру—таму прэмія.

Мы таксама праводзім дні рабочай моладзі. Звычайна, да гэтага дню, падрыхтоўваецца сьветавая газэта (вядома, ня ўсюды). Газэта прысьвячаецца якому небудзь конкрэтнаму пытаньню. Вось, напрыклад, высоўваецца пытаньне аб міжнародным становішчы. Газэта складаецца з карыкатур на гэтаму пытаньню.

Уся заля выказваецца, што намалёвана. Комсамолец (які кіруе днём) папраўляе памылкі, пасьля дэмонстраваньня газэты падлічвае хто больш даў правільных адказаў. Комсамольцам, якія лепш адказалі на пытаньні, даюцца прэміі (кніга, блёк-нот і г. д.).

Тут-жа паведамляюць, на якую тэму будзе наступная газэта. Гэта робіцца з мэтай, каб усе падрыхтаваліся.

Конкурс на лепшага дэклярматара і сьпяваку

Юнсэкцыя організавала конкурс на лепшага дэкляматара і сьпяваку. Раней быў падрыхтаваны вечар, прэміі, абвестка аб конкурсе. За тыдзень да конкурсу таварышы запісваліся на выступленьне.

На вечары выступіла 16 таварышоў. З цікавасьцю слухала моладзь сваіх лепшых сьпявака і дэкляматараў. Вось ён лепшы жлобінскі дэклямьтар Рэвякоў—маленькі хлапчук, вось з лепшых сьпявакаў Кульбякава і Лавецкі Васіль. У перапынку грае струнны оркэстр юнсэкцыі. Пасьля вечару раздаваліся прэміі.

Гэты самы

Піонэры--турыстыя.

Тэхнічныя гурткі Бабруйшчыны.

350 піонэраў у гуртках.

(Бабруйшчына).

У Бабруйску, Жлобіне і Рогачове мы маем каля 20-ці гурткоў тэхнічных ведаў. Гурткі налічваюць да 350 піонэраў старэйшага ўзросту. Так, у Бабруйску добра працуе гурток мастацтва. Там піонэры размалёўваюць розныя шкатулкі, пасьценгазэты, карткі, робяць клішэ, якія часам скарыстоўвае рэдакцыя акруговай газэты.

Акрамя гэтага, гурток выпушчае спэцыяльную насьценгазэту, у якой асьвятляе быт і працу атраду. Газэту чытаюць і дарослыя сябры клюбу.

Працуюць гурткі кройкі і шыцьця, пераплётны, мадэльшчыкаў, організуецца сталярны гурток, якім будзе кіраваць спэцыялісты, сябра саюзу.

Гурткі ня толькі даюць піонэрам працоўныя навыкі, але і практычна дапамагаюць у працы клюбу: размалёўваюць плякаты, газэты, лёзунгі, пераплятаюць кнігі з бібліотэкі.

Каб пашырыць працу ў гэтай галіне,—атрады пачалі склікаць сходы бацькоў піонэраў. Апошнія, добра азнаёміўшыся з працай атрадаў,—практычна дапамагаюць піонэрам. Бацькі атраду саўгандслужачых на свае сродкі купілі інструманты для пераплётнага гуртка. Матка з таго-ж атраду ўзялася кіраваць гуртком кройкі і шыцьця.

Але нельга казаць, што ўсё ў нас добра у гэтай галіне: местачковыя і вясковыя піонэр-організацыі яшчэ нічога ў гэтым напрамку ня робяць. Некоторым комсамольскім ячэйкам і профсаюзам трэба пайсьці на сустрэч організацыі гурткоў тэхнічных ведаў, дапамагчы ім матар'яльна.

Найман

Вопыт ляхаўкі

— Прыпаднесьці піонэрам тэхнічныя веды і організаваць іх адпачынак,—вось лёзунгі, якія знайшлі свае практычнае ажыцьцяўленьне ў Ляхаўскай раённай піонэрорганізацыі.

Вырашыўшы першы лёзунг шляхам утварэньня у раённым маштабе цэлага шэрагу гурткоў: пераплётнага, сталярнага, шумавога оркэстру і г. д., Ляхаўскае райбюро занялося організацыяй, у цікавай і карыснай форме, адпачынку для піонэраў і дабілася у гэтым напрамку значных вынікаў.

Так, улічыўшы цягу і імкненьне піонэраў да экскурсіі і падарожжаў, райбюро організавала групы турыстых, якія цяпер ахапілі больш чым 100 піонэраў.

Ня глядзячы на кароткі тэрмін свайго існаваньня (усяго 1 месяц) група ўжо правяла падарожжа з Менску ў Барысаў.

Думка аб гэтым падарожжы у Барысаў радзілася на першым організацыйным сходзе членаў турысцкай групы. Яе ажыцьцяўленьне патрабавала вялічэзных клапот, энэргіі, а, галоўнае, сродкаў.

Але піонэры сур'ёзна аднесьліся да задуманага і распачалі падрыхтоўку да падарожжа. Былі наладжаны платныя вечары на атрадах і школах, увесь збор ад якіх пашоў у карысьць экскурсыйнага фонду. Таксама матар'яльна дапамаглі паездцы некаторыя ўстановы, як: Менакрана, рэдакцыя «Дэр Юнгер Піонэр» і інш.

Такім чынам складалася сума дастатковая дзеля паездкі з Менску у Барысаў—150 рублёў.

Сама паездка была наладжана 3—16 красавіка, у час вясеньніх вакацый. За тыдзень да свэй паездкі, піонэры-удзельнікі падарожжа пасьпелі шмат чаго зрабіць. Яны дасканальна азнаёміліся з горадам Барысавым з яго мясцовасьцямі, акраінамі.

Падарожжа, на водгуках павадыроў удзельнікаў экскурсыі, дала піонэрам шмат карыснага, павялічыла іх цікавасьць да падобных экскурсый і наогул да турызму.

Пакуль што ўтварэньне групы турыстых цалкам сябе апраўдала. Далейшае пакажа, наколькі правільны шлях узяла Ляхаўскае райбюро організаваўшы піонэраў у турысцкую групу.

З-г.

8-мы Усебеларускі зьезд саветаў скончыў сваю працу

З прамовы тав. А. Г. ЧАРВЯКОВА пры зачыненьні зьезду

„...Мы знайдзем даволі сіл, калі трэба будзе абараняць нашы правы."

Зьезд аб падзеях у Кітаі.

У сувязку з падзеямі у Кітаі рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі заявілі, што яны гатовы аддаць усе свае сілы, каб абараніць незалежнасьць і правы савецкіх рэспублік.

Рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі у пастанове VIII зьезду саветаў заявілі, што яны патрабуюць ад ураду СССР, каб ён прыняў усе сродкі дзеля таго, каб не дапусьціць у далейшым такіх гвалтоўных нападкаў, якія мелі месца з боку рэакцыйных груп кітайскай буржуазіі.

Мы вайны ня хочам, але мне думаецца, што мы цяпер знаходзімся ў такім становішчы, пры якім мы знойдзем даволі сіл, калі трэба будзе абараняць нашы правы, нашу незалежнасьць, магчымасьць далейшай мірнай працы.

Мы ня хочам умешвацца ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў.

Калі я нядаўна быў на зьезьдзе саветаў Гомельскай акругі, дык там з боку рабочых і сялян я чуў многа заяў аб тым, чаму савецкі ўрад не прымушае імпэрыялістычныя дзяржавы спыніць зьдзекі над працоўнымі, чаму савецкі ўрад ня прымае больш рашучых крокаў, каб дапамагчы працоўным у іх барацьбе за сваё вызваленьне. Асабліва настойлівымі былі такія заявы, калі працоўныя Гомельскай акругі даведаліся больш падрабязна аб тых зьдзеках, якія адбываюцца ў сучасны момант над рэволюцыйнымі працоўнымі масамі у Заходняй Беларусі, у Польшчы.

Для нас гэтыя настроі рабочых і сялян зьяўляюцца зусім зразумелымі.

У працоўных Савецкай Беларусі ня можа быць іншых настрояў, калі з замежжаў сюды нясецца кліч аб дапамозе. Сёньня ў нашых газэтах мы чыталі кліч аб дапамозе, які раздаўся з Заходняй Беларусі ў сувязку з недародам, у сувязку з тым, што там сялянства ня мае надзеі на атрыманьне з боку свайго ўраду.

І зусім зразумела, што наш урад ня можа нішчыць настрояў, накіраваных у бок усялякай дапамогі рабочым і сялянам у суседніх дзяржаў у іх цяжкім становішчы. Савецкі ўрад ня хоча сілай умешвацца.

Мы жадаем мірных дабрасуседзкіх адносін з Польшчай.

Мы хочам мець магчымасьць весьці ў далейшым мірную працу. Наш рабочы і селянін хацеў бы мець магчымасьць знаходзіцца ў мірных абставінах, каб хутчэй вырашыць усе задачы нашага соцыялістычнага будаўніцтва. Але як рабочы, так і селянін добра ведаюць, што спробы савецкага ўраду заключыць дагавор з Польшчай аб узаемным ненападзе да гэтага часу добрых вынікаў яшчэ ня далі.



Мы ўсе з вялікай прыемнасьцю чыталі, што парафавалі дагавор з латвійскім урадам. Гэта значыць, што на той мяжы, дзе Савецкая Беларусь і Савецкая Расія мяжуюцца з латвійскай рэспублікай, мы маем ужо магчымасьць быць спакойнымі, бо з боку латвійскага ўраду мы знашлі спрыяючыя адносіны да нашай прапазыцыі аб сумеснай мірнай працы і мірным суседзкім жыцьці. Але гэтай упэўненасьці пакуль што ў нас няма там, дзе праходзіць мяжа з польскай рэспублікай.

Ня глядзячы на нашыя прапановы, мы не атрымалі яснага адказу і, зразумелая рэч, рабочых і сялян Савецкае Беларусі, занятых мірнай працай, не пакідае думка аб тым, ці ня трымае наш сусед камень за пазухай, таму што ня хоча ўстанавіць такіх добрасуседзкіх адносін, якія ўстаноўлены і ўстанаўліваюцца паміж намі і латвійскай рэспублікай.

Тэрыторыяльнае і констытуцыйнае афармленьне Савецкай Беларусі.

VIII зьезд саветаў у гісторыі разьвіцьця Савецкай Беларусі мае значэньне рубяжу. На VIII усебеларускім зьезьдзе саветаў замацаваны ўваход у склад Беларусі ўсіх абшараў з большасьцю беларускага насельніцтва, якія знаходзіліся на тэрыторыі Саюза Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Такім чынам на 8-ым зьезьдзе саветаў Савецкая Беларусь закончыла сваё тэрыторыяльнае афармленьне.

Таксама на 8-м зьезьдзе адбылося канстытуцыйнае афармленьне Савецкай Беларусі, як дзяржавы.

Пераходзім даваенны ўзровень.

VIII усебеларускі зьезд саветаў падцьвердзіў, што мы на нашым экономічным і культурным фронце дабіліся даваеннага ўзроўню, а ў некаторых галінах нашага жыцьця, як напрыклад—у культурнай справе значна выпярэдзілі даваенны ўзровень.

Барацьба з бюракратызмам і спрашчэньне апаратаў.

Пры разглядзе справаздачы нашага ўраду баявым момантам было пытаньне аб барацьбе з бюракратызмам. Гэтае пытаньне выпуклілася, завастрылася, яно выклікала асаблівую зацікаўленасьць і ўвагу з боку ўсіх удзельнікаў зьезду, і гэта зусім зразумела.

З бюрократызмам трэба весьці барацьбу, бо наш савецкі апарат павінен быць апаратам, які адбівае настроі, які выконвае жаданьні рабочых і сялян.

Пастановы VIII зьезду саветаў будуць дапамагаць нам у вырашэньні гэтай важнейшай задачы.

Узмацніць прамысловасьць.

Мы шукалі адказ на запытаньне, што цяпер асабліва патрэбна рабочым і сялянам у нашым агульна-гаспадарчым будаўніцтве. Мы сьцьвердзілі, што патрэбна хутчэй нашу сельска-гаспадарчую краіну зрабіць краінай прамыслова-сельска-гаспадарчай. Нам трэба ўзмацніць значэньне прамысловасьці ў нашай краіне. Нам трэба, каб прамысловасьць у нас адыгрывала кіруючую ролю. Гэтым будзе забясьпечана магчымасьць хутчэйшага экапамічнага разьвіцьця нашай краіны. Мы тут зьвярнулі ўвагу на тое, каб даць нашаму насельніцтву больш танныя тавары, лепшай якасьці і ў патрэбнай колькасьці.

Даёш добры ўраджай!

— «Даеш добры ўраджай». Вось той лёзунг, пад якім мы абгаварвалі тут на зьезьдзе даклад НКЗемляробства. Таварышы, давайце ўсю нашу працу ў вёсцы ў галіне сельскай гаспадаркі праводзіць пад гэтым лёзунгам: «Даёш добры ўраджай».

Пашырыць будаўніцтва ў нашых гарадох

Без рабочых як мы адзначылі і на сэсіі ЦВК, ня можа быць прамысловасьці, а рабочыя покуль што жывуць яшчэ у нас у надзвычайна цяжкім кватэрным становішчы.

Таму і хваравітасьць сярод рабочых большая, чымся сярод сялянства; таму і сьмертнасьць сярод рабочых большая, чым сярод сялянства; таму дзеці ў гарадох больш хваравіты, чым у вёсцы. Вось чаму наша рэспубліка паставіла пытаньне аб тым, каб хутчэй узмацніць будаўніцтва ў гарадох. Гэтым будзе захавана рабочая сіла, бо без рабочае сілы мы ня вырашым важнейшага пытаньня—разьвіцьця нашае прамысловасьці.

На барацьбу з няпісьменнасьцю

Урад напружвае ўсе свае сілы, каб ліквідаваць няпісьменнасьць, каб магчыма шырэй распаўсюдзіць асьвету сярод нашага сялянства. Мы маем у гэтай галіне значныя дасягненьні.

Але ўсё-ж такі пакуль што нас гэта не здавальняе. Я бы хацеў тут адзначыць тое, што адзначыў і тав. Адамовіч у сваім дакладзе—гэта, што ў галіне асьветы мы маем значныя вынікі дзякуючы таму, што наша настаўніцтва ўсе сваі сілы аддае для барацьбы на трэцім фронце, супроць няпісьменнасьці.

Зьезд з задаваленьнем можа адзначыць значную ролю нашага настаўніцтва.

Трэба прыйсьці на дапамогу савецкаму ўраду, каб да 10 гадавіны аслабаненьня Савецкай Беларусі ад белапалякаў у нас ня было ніводнага непісьменнага.

Кожны з нас павінен добра ведаць констытуцыю.

Трэба, каб кожны з нас добра ведаў констытуцыю, каб кожны з нас на падставе гэтай констытуцыі прымаў удзел у кіраваньні дзяржаваю. Гэта забясьпечыць нам магчымасьць вырашэньня ўсіх тых задач, якія перад намі стаяць.



Майская экскурсыя

Маладым чыгуначнікам—ільгота.

Рэдакцыя газэты ЦК ЛКСМБ „Чырвоная Зьмена" наладжвае ў першай палове мая вялікую экскурсыю рабоча-сялянскай моладзі па маршруту Ленінград Волхаўбуд Кронштат.

Чыгуначная моладзь (пры ўмове атрыманьня ад адміністрацыі дармовага праезду) залічваецца ў склад экскурсыі на ільготных умовах (усяго будзе каштаваць 21 руб. замест 35, пры чым першая палова грошай павінна быць унесена да 1-га мая, а другая палова—да дню ад'езду).

Заявы аб залічэньні ў экскурсыю перасылаюцца да 23-га красавіка па адрасу: Менск, Комсамольская вуліца, дом № 25, рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена". Для экскурсыйнай камісіі.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена".

ЗАРАСТАЮЦЬ У ЦАРКВУ СЬЦЕЖКІ,--

У варот быльнёг парос, а папы крычаць як попкі: у гэты дзень—„ХРЫСТОС ВАСКРОС“

Што рабіць на вялікдзень?

За апошні час антырэлігійная праца ў комсамоле **значна аслабла**. Гэта нельга прызнаць нармальным, бо яшчэ значныя пласты працоўнай моладзі гораду і вёскі знаходзяцца на мяжы ад веры да бязбожніцтва.

Надыходзячае сьвята **вялікдзень павінна быць выкарыстана як для разгортваньня антырэлігійнай прапаганды, так і шырокай організацыі культурнай працы з мэтаю адцягненьня моладзі ад выконваньня рэлігійных абрадаў, п'янства і г. д.**

Трэба ў хатах-чытальнях, ленінскіх кутках у гэтыя дні праводзіць гутаркі на тэмы: **1-е мая і вялікдзень, адкуль паходзіць вялікдзень, ці магчыма васкрасаньне з мёртвых, навука і рэлігія і інш. прыродна-навуковыя тэмы. Варта, напрыклад, наладзіць лекцыю настаўніка ці другога спэцыяліста на тэму «цуды бяз цудаў» (цуды хэміі, механікі, мэдыцыны).**

Варта прысьвяціць і выпуск спэцыяльных нумароў насьценных газэт. Дні вялікадня павінны быць скарыстаны для разгарненьня культурна-масавай працы: трэба **наладзіць цікавыя вечары**, пусьціць у ход кіно-перасоўкі, **склікаць конкурсы гарманістых**, балалаечнікаў, добрых стральцоў, конкурсы плясуноў, масавыя гульні і інш.

Калі дазволіць надвор'е—наладзіць прагулкі, экскурсіі ў саўхоз, на культурную гаспадарку, на балотную станцыю.

Для пасьпяховага правядзеньня ўсёе гэтай працы, ячэйкам неабходна загадзя падлічыць усе свае сілы: гарманістых, запявал, організатараў гульняў, плясуноў, расказчыкаў, жартаўнікоў, склікаць іх на нараду і пры іх непасрэдным удзеле правесьці сур'ёзную падрыхтоўку, не дапускаючы суму ў вялікодных вечарох.

Працу антырэлігійную трэба замацаваць. Для гэтага неабходна дагаварыцца з парт'ячэйкамі, павесьці агітацыю за ўцягненьне моладзі ў ячэйкі таварыства бязбожнікаў, паставіць пытаньне аб конкрэтнай працы комсамольцаў у гэтых ячэйках.

Трэба канчаткова адмовіцца ад форм **змаганьня з царкоўнай хлусьнёй, шляхам нацiскаў, або загадаў**. Таксама нельга **сьмяяцца яшчэ і з тае нязначнае часткі моладзі, якая ходзіць у царкву**. Такую моладзь трэба ўцягнуць у нашу культурна-масавую працу, дапамагчы ёй знайсьці працу, якая заменіць «царкоўную асалоду».

У гэтыя дні нам трэба быць больш, як калі падрыхтаванымі, больш як калі прытрымлівацца пагаворкі: **сем раз адмер, а раз адрэж.**



Аб рэлігіі.

(Лёзунгі і думкі).

«Барацьба супроць рэлігіі ёсьць барацьба супроць таго сьвету, духоўным араматам якога ён зьяўляецца

Яна ёсьць опіум народу».

К. Маркс.

«Чалавек творыць рэлігію, рэлігія ня творыць чалавека».

К. Маркс.

„Карысьць, якую прыносіць чалавецтву рэлігія, падобна на карысьць кастыля, але хто ня мае патрэбы ў кастылі, той лепш ходзіць“.

Дзідро.

„Кожны раз, калі навука робіць крок наперад, бог адступае на крок назад“.

Пакэ.

Пад гармонік

Пятрусь.

Вось так дзень, пагода хмурна,
Пасівела ўся зямля.
Рад спаткацца з табой, Нюра,
Нюра, красачка мая.

Нюра.

Пападзі, мой пролетары,
Вачаняты ў цябе кары.
Навімай ідзі капей
І ввай к папу мяне.

Пятрусь.

Як турнула моцным градам,
Ліст бярозавы упаў;
Адмянілі ўсе абрады,—
Я жадаю без папа.

Нюра.

Што ты! Што ты! Што ты, Пеця!
Дзе пра гэта пісана,
Каб жаніліся дзяўчаты
Без малітвы Ціхана?!?

Пятрусь.

Зараз нават пахаваньні—
Без папа і прычытаньняў,
А стары дзядок Лявон
Сказаў бацю:—Качысь вон!

Нюра

Скасавалі ўсе абрады,
Ну, а гэта што, парадак—
Жэніць сельсавецкі люд
На машынцы «Ундэрвуд»..!

Пятрусь.

Весялей ігпай гармонік,
Бяз мілой не пражывеш...
Хопіць Нюрка, мая Нюрка,
Лішні ерасі чаўпеш!

Нюра.

Ну,.. я згодна без амвону,
Толькі перастань злаваць.
І к вясельлю самагону,
Пятрусёк, ня трэба гнаць.

Абое разам.

Ну і дзень, надвор'е ясна.
У царкву народ ня йдзе,
За ваколіцай на полі
Трактар новенькі гудзе.

Частушкі

Няўжо й сёньня поп Астап
Яек нажарэцца?
Але хто цяпер дурны,
Хто ў царкву папрэцца?

У нас ў ячэйцы зразумелі
„Працаўньку“ папоўскую,
І зацягнулі ў адказ
Песьню комсамольскую.

А цяпер зусім ня тое,
Усе мы зразумелі,
Нават нашы старыкі
Іншае запелі.

Вось стары Яўхім казаў:
—„Бог твой не памог,
Будзеш глебу угнаець
Будзе расьці збожжа“...

Мой гармонік за усім сачыць
Усё ў мех зьбірае,
На ўвесь сьвет, як прыдзе час
Ён нам засьпявае.

Гарманісты Міхась Ярнікоўскі.

Духоўныя цуды.

1) Нябачаны волас прасьвятых, прысьнаблажэнныя і прэнепарочныя матары господа нашага Ісуса Хрыста.

2) Цямнота Эгіпэцкая.

3) 25 пудоў цьвічкоў, імі-ж гасподзь наш Ісус Хрыстос—прыбіт быў да крыжу.

4) Сіе цуда апошняе і для нас, папоў—самае радаснае: як веруючыя нясуць нам, папам, вялікодныя яечкі. Амінь!

Каго ісцаляюць цуды?

Замаркоціўся поп Панкрат.

Як з бяды вылезці. Ажно падвёртваецца да яго карчмар, дый кажа:

— Слухай, бацю, якое наша жыцьцё! Твае жыцьцё—дрэнь, а мае яшчэ горшае.

Да цябе мала ў царкву ходзяць, а ў мяне харчэўня пустуе! Тра' нам як небудзь схітраваць, каб грошы самі ў кішэню ляцелі.

Э-э-э!—зацягнуў поп, адкінуўшы двума пальцамі брудную кроплю, якая вісела ў яго пад носам;—колькі на хітрыкі ня пушчайся, але народ, брат, няпераказ ня дурны. Крыж жыватворчы, абраз абнаўлёны, вада багаяўленская—усё чыста на смарку пашло. Пачынаху ў няверчі ўпадаці.

Фі-ы, які ты дурны,—кажа той,—дай толькі мне абраз сьвятой багаматары дык і табе і мне добра будзе.

Дзівіцца поп. Ніяк сьцяміць ня можа навошта яўрэю патрэбен вобраз, але даў такі.

А той тым часам прыляпіў да вобразу па кутках сьвечкі, запаліў іх, ды пусьціў па рэчцы з прыказкай:

Паплыў вобраз, паплыў, а на ёй сьвечачкі так ярка гараць... Бо наўкола было ціха-ціха, нават вербы, якія пазьвісалі гальлём над ракой, ні кранулца хаць-бы адным лістком.

Водаль рыбакі рыбу ловілі.

Як загледзелі на сярэдзіне ракі запаленыя сьвечкі—дзіву даліся.

Бліжэй—бачаць вобраз сьвяты.

Адкуль гэта? Ня інакай—чудатворчы Панесьлі да папа Панкрата.

І з таго часу папоўскае жыцьцё—разьлюлі маліна! Нават па сырах і масьле пачаў коўзацца.

І шынкар ня ў крыўдзе.

Прыедзе пілігрым на маленьне да «прошчы». Вось і заробак.

Аднаго разу прыехаў хворы на ісцаленьне і застанавіўся ў карчме.

За вячэрай і пытаецца гаспадара:

— Ну як, карчмар, скажы, ці папраўляюцца людзі ад гэтага вобразу ці не?

А хто яго ведае—адказвае наіўна карчмар—мо' часам хто і папраўляецца. Але мне толькі дасканала вядома, што дзьве асобы, дык дужа паправіліся...

Рыгор Камлыга.

Буржуй: — Бачыш, селянін, Хрыстос быў першым соцыялістым, а сам цярпеў і вам вялеў. Каўцкі называе Хрыста соцыялістым).





«Любіце ворагаў вашых, благаслаўляйце тых, хто вас ненавідзіць».

ЧАМУ ЁН ПЕРАСТАЎ ВЕРЫЦЬ.

(Праўдзівае здарэньне з дзядзькам Фабуком)

Дзядзька Фабук—рэдкі чалавек у нашыя часы, ён гэта сам адчувае і гэтай рэдкасьць надае яму некаторы гонар, якім ён і даражыць у патрэбныя часы.

Не малады дзядзька Фабук—восьмы дзесятак яму ідзе, але яго бадзёрасьць, праца, якою ён займаецца (Фабук—муляр) не паказваюць на старасьць.

І відарма часта старыя дакараюць хлапцам—смаркачы вы, а не людзі! Што вы хваліцеся цяперашнім сьветам. Гляньце вы на Фабука. У параўнаньні з імі—вы ноль! На двор у мароз выскачыш—губы, нос пасінеюць. От табе ты й малады! А Фабуку ты дай чарку гарэлкі, дык, брат печы будзе рабіць і ў мароз за мае-мае!

Супроць такіх слоў ніхто не спрачаецца, бо Фабук сапраўды быў такім.

Гэта быў чалавек вышэй сярэдняга росту, шырокапачы, з лысінаю на галаве, на баках якой апускаліся на шыю даўгія белыя, мяккія, як лён, валасы. Твар меў выгляд здаровага чалавека, і вачэй быў чырвоны. У ўпаўшых вачох сьвяцілася бадзёрасьць, радасьць.

Дзядзька Фабук шмат дзе па сьвеце вандраваў, шмат усякіх прыгод перажыў, бачыў і чуў.

І за тым у вольныя хвіліны, доўгія вечары, ён мог шмат аб чым расказаць з свайго бачанага.

Напраўдзе, яго любілі слухаць, як старыя, так і маладыя. Ён нават вершы, частушкі піша. Не ўсё, з'ядуцца, займацца гэтым! Ён і не займаецца. У яго самолыцца, як на жарновы камень, незразумелая для яго «поэзія». Усякія прыгоды, здарэньні знашлі свой адбітак у яго творчасьці.

Аб ім у ваколіцы склаліся цэлыя паданьні.

— Ты бы паслухаў, што Фабук саставіў!

— Вось дык галава, як ён усё і запомніць!

— А скла дна. Слухаў-бы, ды слухаў.

Дык і ня даіва, што Фабука кожны рад быў паслухаць.

І Фабук апавядаў. Апавядаў проста, зразумела, з паважнасьцю. Шмат ён «казак» ведаў, як казалі старыя. Толькі ў гэтых «казках» было шмат праўдзівага перажытага.



Мчыцца тройка удалая, З пад абцасаў пыл курыць.

Аб усім Фабук апавядаў з ахвотаю, толькі адно здарэньне з яго жыцьця ён апавядаў вельмі рэдка.

Не хацеў успамінаць таго, што каштавала шмат глыбокіх перажываньняў. Не хацеў думаць, успамінаць аб тым, што ў свой час зрабіла цэлы пераварот у яго жыцьці.

І здарэньне было цікавае, бо яно дало дзядзьку Фабуку мянушку «Бязбожнік». З таго часу ён і зрабіўся няверуючым.

І калі старыя ставілі маладым у прыклад Фабука, то хлопцы казалі:

— Калі браць прыклад з Фабука, то ва ўсім!

Тады старыя дадавалі папраўку:

— Ва ўсім, апрача бязбожніцтва, бо гэта на раду напісана самім богам. Ён сам мо, гэтага не хоча.

І маладыя хлапцы тады сьмяяліся, а мужчыны злавалі.

II.

Аднаго разу Фабук дакурыў папяросу і, кінуўшы яе ў куток, пачаў гаварыць далей:

— Было гэта гадоў дваццаць таму назад. Тады я ў ксяндза быў першаю рукой. Усё што ксёндз гаварыў рабіць—рабіў, хоць гэта, часам, каштавала шмат клапот.

І так цягнулася шмат гадоў. Можа-б дажыў ужо да глыбокае старасьці, каб не здарэньне, якое адчыніла мне вочы...

Учытальні зрабіліся яшчэ больш цішэй. Усе нарыхтаваліся слухаць тое, аб чым Фабук рэдка калі гаварыў.

— Час надыходзіў к валікдню. Усе ваны засьценкаўцы, па хрысьціянскаму звычаю, ехалі ачышчацца ад грахоў перад валікім сьвятам. Адна' ніядзелі паехаў і я.

Не сьпяшаючы распрог каня, паставіў яго ля паркану, дзе заўсёды ставіў, і, падкінуўшы яму сена, пачаў прыбіраць воз. Бачу—прэ з касьцёлу арганістаць.

— Дзень добры!—Кажу яшчэ здалёк. Адказваць ня хоча. Бачу ня ў духу, гаварыць ня хоча, а пасьля калі закрычыць,

— Ты чаму тут каня паставіў?

— Хачу тут ставіць, у каго мне пытаць?

Гэтыя словы, як нажом, кальнулі арганістага. Ён нічога больш не адказаў, а завярнуўся і хуткімі крокамі пашоў у касьцёл. Праз некалькі хвілін ідзе адтуль з ксяндзом. Зразу цюкнула мне, што тут ня проста.

Прыцца проста ка мне, а твар чырвоны ад злосьці, як крывёю абліты.

Зьняў я шапку і толькі хацеў пацалаваць ксяндза ў руку, а ён калі засмаліць мне, гэтым часам, у шчаку. Горача мне зрабілася, зазьвінела ў вушох, у вачох пацямнела, іскры пасыпаліся.

— Хто тобе, галган, дазволіў тутэй каня ставіць? Сьціснуў я зубы, нічога не адказаў, бо нямог—злосьць сьціснула горла. Ксёндз завярнуўся і пашоў назад. Арганісты здаволены сваёю адплатаю ішоў з боку і нешта лісьліва гаварыў.

— Во гэта прывітаўся, патаварыску, значыць—рагаталі, стаўшыя побліз селяне, ведаўшыя мяне, як шчырага прыслужніка касьцелу. Я маўчаў, а думка «гэта адплата за тваю доўгачасовую шчырую службу»—так і лезла ў галаву, не давала супакою. Гэта яшчэ больш жалобіла мяне. Запрог каня і паехаў да хаты, не застаючыся ў касьцёле.

Пры гэтых словах Фабук сьціх, углыбіўся ў думкі і моцна адкашляўся.

— Што-ж далей было?—Нецярпліва запыталі хлопцы.

— Далей?.. Сьмеху, кпінаў шмат прышлося перанесьці.

Засьценкаўцы расказалі аб усім. Праходу ня было. Малыя дзеці ў вочы сьляцом дзьялі. Пасьля таго ксёндз шмат разоў наказваў—схамянуцца, але дудкі, брат! Засьценкаўцы бязбожнікам празвалі. Цяпер гэта нічога, а тады ого, што значыла гэта слова..

Вураднічку далажылі. Прыяжджаў угаварваць, але рады даць ня мог. Страшыў што ў падаўарным буду, «палітыкантам» буду лічыцца у паліцыі—на ўсё махнуў рукою і пачаў жыць спакойна.

Пасьля таго адпала ўсякая ахвота верыць у тое, чаго сам ня ведаеш.

Ал. Васковы.

Ці патрэбны хатнія вячоркі?

Ажывім і палепшым юнсэкцыі!

(У парадку абгаварэньня. Чакаем водгукаў).

Обухам па хатніх вечарынках.

Гаворачы аб правядзеньні комсамольскага ўплыву на моладзь праз хатнія вечарынкі, я павінен сказаць, што нам ад гэтага трэба канчаткова адмовіцца. У гэтым пытаньні я цалкам згодзен з думкай тав. Зязюлі, які добра падкрэсьліў тое, што нашыя комсамольцы, як пойдуць рабіць комсамольскі ўплыў праз хатнія вечарынкі на моладзь, дык глядзі, гэтыя комсамольцы праз нейкі час пачынаюць адрывацца ад комсамолу.

Такія факты маюцца ў нас на МББч., дзе комсамольцы, праводзячы комсамольскі ўплыў на моладзь праз хатнія вечарынкі, рэдка калі ходзяць на сходы ячэйкі й на заняткі політшколы.

І думка тав. Рамізевіча аб узаконеньні вечарынкі з прапановай, каб юнсэкцыі там павялі сваю працу, **зьяўляецца памылковай**. Тав. Зязюля гэта вельмі добра падкрэсьліў у сваім артыкуле. Але мала гэтага, некаторыя могуць сказаць: «Дык нашто-ж нам патрэбна ствараць юнсэкцыі пры клюбах, лепш гэту юнсэкцыю там зусім не ствараць пры клюбе, а стварыць пры ячэйцы ЛКСМБ асобную юнацкую камісію, якая і возьмецца выпаўняць працу юнсэкцыі таго ці іншага клюбу. Гэта я чуў ад многіх чытачоў «Чырвонай Зьмены». Наагул кажучы з хатнімі вечарынкамі **трэба павесьці рашучую барацьбу**, шляхам узмацненьня працы юнсэкцый.

Цяпер адносна памяшканьняў, мы ведаем, што няма магчымасьці юнсэкцыі рабіць гэтыя вечары ў клюбе, дзякуючы таму, што памяшканьне клюбу ў суботу і ў нядзелю занята праўленьнем клюбу, а калі раз у месяц ці ў два ў клюбе ёсьць магчымасьць зрабіць вечар, дык гэтага мала. Вечары павінны рабіцца часьцей, хаця адзін вечар у 2 нядзелі і памяшканьне гэтае можна знайсьці ў школе, як гэта ўжо практыкавалася юнсэкцыяй клюбу Леніна заходніх чыгунак.

Гэта зрабіць трэба неабходна, бо на моладзь мы павінны зьвярнуць вялікую увагу. Моладзь не павінна выхоўвацца ў хуліганскім дусе. **Толькі жывымі формамі працы мы палепшым якасьць вечароў юнсэкцыі і прыцягнем моладзь да яе, а хатнім вечарынкам непавінна быць месца**, на якіх расьце і разьвіваецца цемра і хуліганства.

Чыгуначнік з МББ.

За комсамольскую, супроць мяшчанскай

За апошні час у нас заўважваецца вялікі пад'ём у справе здавальненьня культурных запатрабаваньняў моладзі і у справе колектыўнага сплачэньня апошніх.

Хатнія вечарынкі, якія наладжваліся раней сярод мяшчанскай моладзі, цяпер пачынаюць адміраць і на месцы іх вырастаюць новыя комсамольскія вечарынкі.

Ячэйка прыватных мэталістых наладзіла вечар, на якім адбыўся політсуд над нядысцыплінаваным комсамольцам. Суд быў добра падрыхтаваны і моладзь ім засталася вельмі здаволенай.

Такія вечары прыцягваюць масы моладзі, дзе яна правільна выкарыстоўвае свой вольны час.

Аднача сова з гэтым мы наладжваем колектыўнае наведваньне кіно-тэатру, што стварае таварыскае сплачэньне ячэйкі. Для прыкладу можам паставіць ячэйку «Хімік», юнсэкцыю мэталістых і г. д.

Усё гэта дае магчымасьць адцягнуць моладзь ад тых мяшчанскіх вечарынак, на якіх, бязумоўна, бывае п'янства, бойкі і г. д.

Бравін.

* * *

Ад таго, што некаторыя таварышы ня зусім разумеюць злучэньня культурніцтва і політыкі, ёсьць перагіб кія, які шкодзіць нашай працы.

Комсамольцы **Амсьціслаўскай організацыі** наладжваюць хатнія вечарынкі, на якія запрашаюць розную мяшчанскую моладзь.

Былі выпадкі, калі такія вечарынкі наладжваліся як раз у той час, як працуе політшкола. Гэтым яны перашкаджалі добраму наведваньню школы і нармальным заняткам.

Такія вечарынкі напамінаюць нам нешта старое, гнілое з быту буржуазнай моладзі. Яны перашкаджаюць нашай працы.

На зьмену гэтым вячоркам павінны зьявіцца ячэйковыя вечары, дзе увесь колектыў комсамольцаў сабіраецца для разумнага правядзеньня вольнага часу, дзе ня толькі танцы, але і вусная газэта і спортвыступленьне, і хор, і дэкламацыя.

Комсамольская ячэйковая вечарынка, вось правільны мэтод для карыснага і вясёлага выкарыстаньня вольнага часу.

Янка Ветраў.

Яна ўжо не зайздросьціць...

(Бытавы малюнак)

Алеся—комсамолка з 1922 году. На грамадзкай працы пачала сябе праяўляць яшчэ будучы ў дзіцячым доме.

Улетку хадзіла Алеся з дзяўчатамі часта ў Гарадзкі сад. Там прыглядалася к розным людзям. Асабліва кідаліся ёй у вочы напудраныя і намалёваныя дзяўчаты, якія з расфранчонымі хлапцамі прыходзілі ў сад. Запомніла ўсё гэта Алеся. Ёй пачало здавацца, што яна зайздросьціць гэтым дзяўчатам.

* * *

Між тым, прабыўшы вызначаны тэрмін у дзіцячым доме, Алеся паступіла ў адну з Менскіх профтэхнічных школ.

Ячэйка профшколы давала Алесе розныя нагрузкі, з якімі яна спраўлялася.

У апошнія часы яна была зборшчыкам сяброўскіх узносаў. Потым пры перавыбарах бюро ячэйкі прашла ў сябры бюро, была старшынёй ячэйкі МОПР'у. Паступова Алеся ўсё больш і больш уцягвалася ў комсамольскую працу. Яе тады можна было аднесьці да тых дзяўчат, аб якіх пісаў Бязыменскі: «Вот они, девушки наши таковы! Только с фабрики—в деле гонет».

Ляцелі дні. Алеся часта бывала ў клюбе.

Але тым часам яна пасябравалася з нейкімі дзяўчатамі, не комсамолкамі, падпаўшы пад іх уплыў.

На кожным кроку пачала адчуваць Алеся розьніцу, якая існуе паміж ёй і дзяўчатамі-сяброўкамі, якія бяз усякай сароммлівасьці пудрылася, маляваліся, угаварваючы тое-ж саміе зрабіць Алесе. Але Алеся носіць «КІМ», яна комсамолка і на такую «справу» не рашалася. Таксама на вячорку, куды яе зацягнулі, яна сябе адчувала зусім кепска. Сумная, маўклівая, яна аб чымсьці раздумвала. Тут яна сапраўды ўжо пачала зайздросьціць дзяўчатам, якія бесклапотна і весела кружыліся, бегалі... Яна была тут як-бы не ў сваёй талерцы. Не таму, што яна ня была здольна павесяліцца. Наадварот, на комсамольскіх вечарох ёй сумаваць ня прыходзілася. Не... Алеся раздумвала аб другім...

Прышоўшы дамоў, яна аніяк не магла заснуць. Тут ёй успомнілася, што яе запрасілі яшчэ на адну вячорку, а заўтра-ж пасяджэньне бюро.

Пачала яна раздумваць над тымі абавязкамі, якія накладае на яе комсамол. Заўтра пасяджэньне... А там сход... Прытым-жа яна старшыня ячэйкі МОПР'у, трэба ўжо ўзяцца за працу.

Не... Лепш ня трэба... Я адмоўлюся ад усіх гэтых абавязкаў.

Ня доўга думаўшы, Алеся напісала заяву ў бюро ячэйкі аб аслабаненьні яе ад Комсамолу. Бюро ячэйкі доўга не разважала і прыняўшы пад увагу адарванасьць ад комсамолу, якая пачала назірацца з боку, Алесі у апошнія часы, ухваліла выключыць яе з шэрагаў комсамолу.

* * *

Выхаваўчае значэньне таго асяродку, у які папала цяпер Алеся, ўжо пачынае адчувацца.

Яе месца адпачынку — гэта частыя вячоркі, па якіх яна ўжо ня бывае сумнай. Не...

Да раніцы кружыцца яна разам з усімі ў п'яным чадзе... Гуляць ёй ужо ніхто не перашкаджае. Яна здаволена...

Таксама сяброўкам сваім яна ўжо не зайздросьціць.

Р. Гольдзін.

ВЕДАЙ РОДНЫ КРАЙ!

ДРУКУЕМ МАТАР'ЯЛЫ АБ ГАРАДЗКІХ ЭКСКУРСІЯХ

Што можна бачыць у Менску?

У чарговых нумарох будзе зьмешчаны працяг гэтых матар'ялаў

У сучасны момант гарадзкія экскурсіі, а таксама ў бліжэйшае месяца каля Менску зьяўляюцца, бязумоўна, самымі даступнымі і самымі пажаданымі.

Толькі трэба адзначыць наступнае:

Кожная экскурсія павінна мець вельмі абмеркаваныя мэты. Кіраўнік экскурсіі павінен дасканала ведаць тое прадпрыемства, якое ён паказвае, і пры гэтым павінен памятаць, з кім вядзе экскурсію, каб даваць адпавядаючыя разьвіцьцю аўдыторыі, тлумачэньні.

Удзельнікаў экскурсіі павінна быць ня больш 20-25 чалавек, толькі пры гэтай колькасьці яна будзе карысна.

Перад тым, як ісьці на экскурсію, патрэбна даць уводнае тлумачэньне.

Самую экскурсію трэба праводзіць не сьпяшаючыся, лепш паказаць менш, але-ж прапрацаваць глыбей.

Кожная экскурсія, нават і з дарослымі людзьмі, павінна мець працяг ня болей як тры гадзіны, бо далей ужо ўважліва ня будуць адносіцца — усе будуць зморань.

Трэба шчыльна **ўвязваць** кожную экскурсію з акаляючым жыцьцём.

Трэба апрацаваць, падагуліць той матар'ял, які здабыты на экскурсіі, бяз гэтага час, страчаны на экскурсію, будзе **часам страчаным дарма**.

Зараз мы адзначым некалькі тэм экскурсіяў, якія магчыма правесьці па гораду Менску і яго бліжэйшым ваколіцам.

Беларускі дзяржаўны музэй (Агульны выгляд)

Тэма--стары Менск*)

Агульны агляд гораду і азнаямленьне экскурсантаў з гісторыяй Менску.

Паказаць плян сучаснага Менску і на ім дасканальна азначыць старую частку гораду—Замкавую гару і тыя вуліцы, якія ў даўнейшыя часы ішлі каля замку, ці вялі ў самы замак. Асобна трэба адзначыць такія вуліцы: Замкавую, Падзамкавую, Завальную, Юр'ева-Завальную, тыя вуліцы, якія самі сьведчаць аб старажытнасьці пабудовы гораду. Трэба таксама паказаць Замкавую гару, з якой адчыняецца надзвычайна добры краявід прыроднага ўзмацненьня гораду.

Тут-жа мы пабачым дзьве рэчкі, якія амываюць Замкавую гару—Сьвіслач і Нямігу, а далей, за ракою Нямігай мы пабачым тое месца, якое калісьці звалася Пятніцкім канцом гораду, а за гэтым месцам цягнулася балота.

На Замкавай гары не засталося і сьлядоў ні ад замку, ні ад тых узмацненьняў, якія абкружалі яго.

Па тых вестках, якія засталіся ад старых гісторыкаў, нам трэба намаляваць карціну пабудовы самога замку з яго валамі, узмацненьнямі, канавамі і г. д.

Гісторык **Гвагнін** кажа аб тым, што тут быў адзін драўляны замак, а **Балінскі** сьведчыў у сваім творы (т. 3) аб тым, што тут было два замкі: верхні і ніжні. Верхні пабудаваны ў 1249 годзе, а ніжні пазьней.

Абодвы яны былі драўляныя, абкружаны былі валам і парканам і злучаны паміж сабою ўнутранымі хадамі.

Верхні замак згарэў у 1778 годзе і больш ужо не адбудоваўся. Замак меў свой урадны двор, карыстаўся мытам.

У старых граматах і актах таксама ўпамінаецца аб замку. (Собрание древних грамот и актов Минской губернии, издание 1848 года).

Далей трэба застанавіцца на фасадзе і наогул на пабудове Кацярыненскай царквы, як тыповай пабудовы беларускага стылю. Пры гэтым вельмі цікава разглядзець з экскурсантамі невялічкую з левага боку ад уваходу надгробную пліту якойсьці мяшчанкі **Яроцкай**. Гэтая пліта адносіцца да 1635 году.

Пры азнаямленьні экскурсантаў з гэтай плітою, трэба адзначыць пры чытаньні стыль, а таксама правапіс старога пісьма.

Далей адзначаем Нямігу.

Маленькая прытока Сьвіслачы—Няміга ўзбудзіла каля свайго імя вялікія толькі і спрэчкі. Адны кажуць, што на гэтай магчыма вялікай рацэ і адбылася вялікая бойка, апісаная ў «Слове о полку Игорове».

У Лаўрэнцьеўскім летапісу (стар. 72, выданьне ортографічнай камісіі) гаворыцца наступнае: «в лето 6574 заратися Всеслав, сын Брячиславль, Полоцка и зая Новгород. Ярославичи же тріе—Изяслаў, Святославу, Всеволод, совокупивше вои, идоша на Всеслава зиме сущи велице. И придоша к Миньску и меняне затворишеся в граде; си же братья взяша Менеск и секоша мужы, а жоны и дети ведоша на щиты и поидоше к Немизе, и Всеслав подойде противу.

И совокупишася обои на Немизе, месяца Марта в 3 день и бысть сеча зла».

Як-бы та ня было, а мы бачым, што пясьняр «Слова» добра ведаў Менск. У ім адчуваецца чалавек вялікага размаху, як поэтычны талент.

Бо гэта бяспрэчна, чалавек адукаваны, магчыма нават знаёмы з старадаўнімі клясыкамі; ён ня толькі ведае Менск, але яму вядом Полацак і іншыя паселішчы. Што-ж датычыцца веры, дык у ім мы бачым ідзе барацьба мітычнага сьветапогляду з хрысьціянскімі ідэямі. Дакладныя паказаньні ў славянскім тэксьце наступныя:

...«разбіше славу Ярославу, скочы вълком до Немиги с Дудутак. На Немизѣ снопы стелют головами молотят чепи харалужными, на тоцѣ живот кладут, вѣют душу от тела. Немизе кровави брезе не бологом бяхут посеяни косьтми русских сынов».

Народны поэта БССР Янка Купала гэта самае месца апісвае так:

„Разьбіў Яраслаў там
Прыдбаную славу мячом.
І скачыў праз поле і лог
К Нямізе з Дудутак ваўкам.
На Нямізе снапы сьцелюць галавамі
А малоцяць-жа стальнымі іх цапамі.
На таку жыцьцё кладзецца
неспадзейна,
І душу ад цела веюць
безнадзейна.
Бёрагі ў крыві Нямігі пакалені,
Не дабро на іх пасеяў.
Сяўбіт жменяй.
А былі яны гусьценька
У процьма вузкіх
Таз засеяны касьцьмі
Сыноў рускіх".

Закончыць экскурсію можна паказаньнем валоў гораду, якія знаходзяцца на Савецкай вуліцы. На валох цяпер зьмяшчаецца дзяржаўная бібліотэка.

*) Першыя гістарычныя весткі аб Менску, як аб горадзе Полацкага княжаства, адносяцца да пачатку 11-га стагодзьдзя.

Тэма—гістарычны Менск.

Пачаць трэба экскурсію ў Дзяржаўным Музэі, дзе трэба зьвярнуць увагу на малюнак плошчы Старога Менску.

Далей трэба прысьці на плошчу Волі і тут канчаткова намаляваць карціны плошчы і на ёй ратушы.

З тае прычыны, што плошча Волі калісьці была «Высокім Рынкам», трэба закрануць пытаньне аб экономічным становішчы гораду—Стары Рынак, Новы Рынак, Кірмашы, Нізкі Рынак, Высокі Рынак, сучаснасьць (рынак, ларок, крама прыватнага гандляра, коопэратыў).

Там-жа на плошчы трэба разглядзець Катэдральны каталіцкі касьцёл. Зьвярнуць увагу трэба на стыль пабудовы. Стыль яго беларускі—Барокко. Адчынены ён у 1710 годзе. Да касьцёлу з правага боку прылягае вялікі будынак. Цяпер у ім зьмяшчаецца ВСНГБ. У гэтым будынку калісьці зьмяшчалася езуіцкая колегія і езуіцкі кляштар.

У 1750 годзе езуітамі збудавана гарадзкая вежа, якая прылягае да гэтага будынку (гарадзкі гадзіньнік).

Далей зрабіць пераход да завулку Музыканцкага, дзе зьмяшчаецца дом, у якім калісьці адбываліся пасяджэньні масонаў. Масонская лёжа насіла назву «Паўночнага факелу». Будынак быў пабудаваны крыжападобна, але пры будоўлі, зробленыя апошнім уласьнікам з аднаго боку, зусім зьмянілі першапачатковую архытэктуру гэтага будынку.

Месца для будоўлі гэтага будынку абабрана надзвычайна ўдала: будынак стаіць на высокай, крутой гары. Масонская лёжа была зачынена ў 1822 годзе.



Другім-жа старадаўным будынкам можна лічыць будынак у двары Мясьніцкай вуліцы дом № 9. Ніз гэтага будынку каменны, верх драўляны. У гэтым будынку некалі быў гарадзкі суд.

Трэцім домам, які трэба адзначыць—будзе дом, які стаіць на двары Цэнтральнага дому Асьветы на Комуністычнай вуліцы. Дом гэты двухпавярховы, у шырыню ён мае два вакны, а ў даўжыню пяць.

Трэба зьвярнуць увагу на таўшчыню сьцен, на вокны і іх разрэз (старая архітэктура). У гэтым доме ў часы паўночнай вайны ў 1706 годзе быў цар Пётра. Гэты будынак належаў калісьці кашталяну гораду Менску—Яну Сапезе. Сьцены гэтага будынку бачылі яшчэ аднаго дзеяча старых часоў—Мазэпу.

А. А. Сьцепуржынскі



Этнографічны аддзел Музэю.

Літаратурная старонка

Рыгор Галота



(аповесьць)

Зьмест папярэдняга.

1920 год. Польскія жаўнеры зьдзекуюцца над беларускім сялянствам. Спыніўшыся ў Целяшоўцы абозьнікі гвалцяць дзяўчат. Згвалцілі і Антосю. Несьцярпеўшы зьдзекаў яна кідаецца ў вір, але яе выратоўвае стары мельнік Іван. А навакол лес. У лесе партызанскі атрад Рыгора Галоты сьцеражэ польскі абоз каб адбіць зброю.

Частка першая

VI.

Польскі абоз выехаў з Целяшоўкі, крануўся на позыцыю.

Сонца ўжо ўзыпло і праменьнямі ласкатала верхавінкі высокіх хвой і елак... Жаўранкі віталі ў неабсяжных прасторах, ганяючыся за мошкарою, якая, выплываючы з травы, была смачным сьнеданьнем жаўранкам...

І раптам... елкі і хвоі ажылі... Надышоў час расплаты за зьдзекі, надышоў час помсты за гвалтаўніцтва, надышоў час «падзякі» за далучэньне» да «айчызны», да Państwa...

Трыццаць, а мо' і больш, вінтовак, абрэзаў застагналі, харкнулі па разбэшчаных абозьніках. Трыццаць, а мо' і больш, вінтовак, абрэзаў загарадзілі шлях. Партызанская куля меціць метка! Кожны патрон—на вагу золата! Да таго і Рыгорава кемкасьць... Шлях быў загароджаны бар'ерам са спушчаных хвой. Рынуліся перапуджаныя коні абозьнікаў уперад, рванулі павозкі, затарахцелі колы, ... сталі... А Галота дзейнічаў. Адстрэльваліся і абозьнікі... Назад уцякаць ня прышло ў галаў... Выбух... Страшэнны выбух... Гэта ўзарвалася павозка з коньмі, з людзьмі, з гранатамі. Хмара дыму засланіла сонца, і яно з за хмары здавалася медзяным, чырвоным... Зноў ажылі хвоі, елкі... Наляцелі партызаны. Была справа. І ў справе—хто каго...

А зьверху так ласкава ласкатала верхавінкі хвой і елак тое-ж вечна маладое сонца... Толькі жаўранак сьціх...

У палон не бралі—нашто? З вачэй бруілася кроў. Вусны пылалі полымем. З глоткі ў кожнага вырывалася хрыпота. Хрыпота, кроў, полымя—адплата за зьдзекі, помста. Мужычая помства... Помста за волю мужычых грудзей. Ад таго і хрыпота, бо—хто каго... бо на накутвалі год.

Справа зроблена. Падлічаны страты. Загінула шэсьць. Шмат... Затое патапелі патроны, зброя... Затое зьнікла атарыца гвалтаўнікоў... Дар за дар...

Целяшоўцы чулі справу. Ведалі хто каго...

І калі цэп'ю была абшукана мясцовасьць, калі былі туга набіты партызанскія патранташы, калі абрэзы былі зьменены на ёмкія, дальнябойныя карабіны, калі быў расчышчан сотняй рук шлях, калі было замаскіравана месца справы... толькі тады Рыгор Галота голасна сказаў:

— У логава!.

Двое вачэй глянула скрозь гушчарню арэшніку; відаць паглядзела,' па якому напрамку пашоў Галота, і зьвікла. Вочы былі сэржанта польскай арміі пана Дабравольскага...

— У логава? падмігнуў сэржант... і азірнуўся на свае эполеты. Яшчэ былі сярэбраныя з дзьвума прошвочкамі... І яму здалося, што яны ў яго ўжо залатыя...

У Рыгоравых грудзёх білася сэрца. Дзейнічаў розум... Ён казаў:

— Заставацца атраду ў логаве небясьпечна. Зроблена справа... Сёньня-ж перайсьці ў другі лес...

Як ліса, аглядаючыся, туляючыся, вышаў на шлях Дабравольскі. Ён быў сапраўды адзін сярод вялічэзных лясных абшараў... Былі і іншыя, але не яго... І нечакана ўзрок яго ўгледзіў чыюсьці сумку... Падняў, расчыніў. У сумцы ляжала трохвёрстка. Разгарнуў. І прыліп вачмі. Паміж скучавых тапаграфічных адзінак лесу чыёйсьці рукою было адзначана чорнае кольца...

— Логава? і зубы прыкусілі вусны. На твары лісься ўсьмешка. У чалавека—плян, орыентацыя: Целяшоўка, Трушава, польская застава, тэлефон, войска, логава —чорнае кольца на трохвёрстцы... Адным словам—дзейнічаць. Сэржант начаў дзею...

Антося расчыніла вочы. Яна ляжала но ложку ў мельнікавай хаце. І як толькі яна паглядзела праз вакно на сьвет—вочы наліліся сьлязьмі. Яна зачыніла іх, бо млявасьць агарнула яе. І як толькі муха ўкусіла шчаку, якіх так багата ў летні час у Іванавай хаце, немы голас вырваўся з грудзёй... Ёй здалося, што кусае яе той жаўнер, што сёньня ў ночы згвалціў яе. Яна выкаціла проста на лоб перапалоханыя вочы... Над ёю стаяла яе маці, бацька гутарыў з Іванам... У хаце гулі раі мух...

— Што з табою дачушка? ласкавым, матчыным голасам спытала Антосіна маці ў Антосі.

— З чаго гэта ты?

Антося цяпер успомніла сёньняшнюю ноч, пра вечарынку, пра чорныя думкі... Пальцы моцна сьцісьнуліся ў кулакі... Узьняліся высака грудзі... Матцы яна расчыніла сваё сэрца шопатам прамовіўшы брыдкае, ганебнае слова:

— Згвалцілі... палякі...

Па матчыным твары скацілася пара сьлёз, за ёй другая пара, трэцяя... Уткнуўшыся ў фартук ціха плакала маці. Бацька апусьціў галаў...

Антося паціху вадзіла вачмі з боку у бок...

Каты! сказаў бацька і моцна вылаяўся.

— Вядома палякі! дадаў стары Іван.

Дзень зьмяніла ноч, ноч зьмяніў дзень. Па вёсцы хадзілі чуткі, што хутка у Целяшоўку прыедзе карны атрад.

А навакол Целяшоўкі стаяў ціхі надвечны лес, верхавіны якога ціха гушкаліся ад ветру...

Быў тысяча дзевяцьсот дваццаты год...

(Канец першай часткі)

Ад рэдакцыі: На гэтым спыняем друкаваньне аповесьці Іл. Барашкі «Рыгор Галота». У недалёкай будучыне чытач угледзіць яе асобныя выданьнем.





Думкі

(У Зах. Беларусі забіта сем комсамольцаў).

I.

Ў шапцы сярэбраных зор
Сьпіць сінябокі бор.
Ў срэбную майскую ноч
Хто пагуляць ахвоч?!

Поле лягло у расу,
Луг салаўём зьвініць,
Люд працавіты сьпіць,
Скінуўшы з плеч касу.

А салаўіны звон
Па за ракой грыміць.
Думку раджае ён,
Думка кудысь ляціць...

II.

Помню: зіма была,
Іней адзеў палі.
Белым быў твар зямлі.
Бура—мяцель плыла.

Сьнег рассыпала наўкол—
Ў бель адзявала дол...
Шэры, газэтны ліст
Востак мне кінуў шмат.

Думкі ў клубок за...сь,
Дзесьці загінуў брат...
Згінуў хаця-б адзін.
Ды не адзін, а сем—

Сем м...ла...х цьвілі
Як в...лькі у аўсе...

Чорная казка-быль
Думкі у вір вядзе...

Вечар тануў у крыві
Болей няма сямі...
Заход гарыць агнём,
Захад у рухах паноў.

Перад яскравым днём,
Цемра гусьцее зноў,—
Чуецца плач аноў...

. . . .

III.

Вырваўся з думак я
Месяц плыве чаўном,
Песьня чутка салаў'я.
Лес шапаціць лістом...

Месяц заплыў за лес.—
У вёсках ўстае народ
Казачны схіл нябес
Заружавеў усход...

Гаснуць крышталі зор,
Поле—ў агнях расы
Сіні, таемны бор
Песьні пачуў касы...

Думкі бадзерыць май,
Радасна стала мне—
Край мой, радзімы край
Гымны пяе вясьне!

М. Хведаровіч

Вясновыя настроі

Птушынай лявоніхі,
У лісьцях перазвон.
Белае чаромухі,
Захапіў палон.

Дзесьці недалечка,
Дзе дарога-гаць.
Залатыя сьвечкі,
У каштанох гараць.

Граюць пераліві
Сонечнай красы.
У белае каліны,
Капелькі расы.

Сочная атвава,
Срэбрыцца ўзор.
Сонная купава,
Абудзіла бор.

Капалі на вусны.
Капелькі расы.
Прытуліўся моцна.
Я сялянскі сын.

Быццам страціў розум,
Ці здурэў мо' як.
Абдымаў бярозку,
І казаў... мая.



Навіны савецкай навукі і тэхнікі.

Сэрца на кручку і завод пад шклом.

„Непраўдападобныя" рэчы на Пагодзінскай вуліцы.

Ці чулі вы калі небудзь аб тым, **што сэрца можа жыць і працаваць бяз цела?** Што яго можна вынуць, навесіць на кручок, і яно ўпарта і дакладна будзе прадаўжаць сваю справу?

Ці што жывеліна можа жыць бяз крыві?

Хіба адразу можна паверыць, што ў нас жары трэба піць не прастую, а салёную ваду? І што, пасадзіўшы вас у маленькі пакойчык з прыборамі, мігаючымі рознакалёрнымі аганькамі, можна праз некальні дзесяткаў хвілін азначыць, для якой спэцыяльнасьці вы больш годны: ці быць вам сьлесарам, вагонаважатым, шофэрам ці кантарскім служачым, працаўцом, машыністым?

Усе гэтыя «непраўдападобныя рэчы» твораццa ў Маскве, на ціхай Пагодзінскай вуліцы, у маленькіх лябораторыях адзінай у сьвеце установы—дзяржаўнага Інстытуту Аховы Працы.

Сэрца бяз цела.

Як працуюць вучоныя ў гэтым Інстытуце? У адным з гэтых маленькіх пакояў на сярэдзіне стала, застаўленым шклянкамі, прабіркамі, кольбамі і бесканечнай колькасьцю трубачак, стаіць дзіўная прылада: на кручку падвешаны нейкісьці маленькі жаўтаваценькі мяшочак, а на яго зьверху капае безкалёрная жыжа. Гэты мяшочак жыве: ён з дакладнасьцю мэханізму гадзіньніка то сьціскаецца, то зноў расшыраецца, і пры дапамозе прымацаванага да яго рычажка рысуе крывую на валіку, які павольна ўвесь час круціцца.

Аказваецца, гэты жоўты мяшочак—сэрца жабы. Яго вынулі з жабы і прымусілі жыць асобна ад цела, карміцца асобнай жыжаю.

Вынулі для таго, каб вывучыць, як уплывае на сэрца чалавека адзін з самых страшных прамысловых атрутаў—сьвінец. Ён сустракаецца у цэлым шэрагу вытворчасьцяў—у друкарнях, у трубапракатных цэхах, пры вырабу сьвінцовых бяліл і выклікае пявылічымыя болі жывата і страшэнны «сьвінцовы параліч».

Але як вывучаць гэтую атруту? Чалавека-ж нельга атручваць. І інстытут труціць жабу і ў першую чаргу—яе сэрца. У спажыўную жыжу, якая капае на навешанае на кручку сэрца жабы, час ад часу падбаўляюць атруту. І сэрца ў тойжа час адклікаецца на гэтае атрауленьне. Яно само расказвае аб тым, што яно адчувае пры гэтым дакладна і дасканальна запісваючы свае адчуваньні з дапамогаю прамацаванага да яго рычажка на бясупынна круцячымся валіку.

Жыцьцё бяз крыві.

Як-бы добра не працавала сэрца жабы, навешанае на кручку, яно ўсё-ж працуе ў ненормальных абставінах. Каб стварыць яму гэтыя абставіны, а да рэчы выявіць уплыў атруты і на іншыя органы цела, Інстытут распрацаваў выключна цікавую і орыгінальную прыладу.



У жывой жабы ці трусіка ў двух мясцох прарэзваюць вены і ўстаўляюць у іх шкляныя трубкі, злучаныя з цэлай сыстэмай гумавых трубачак, балонаў са сьціснутай паветрай і інш. Пускаючы ў рух маленькі насосік, жывеліну прамываюць спажыўной жыжаю. Кажучы прасьцей—з яго выганяюць усю кроў і замяняюць яе жыжаю.

Вы думаеце—жывёліна памрэ ад такой опэрацыі? нічуць ня бывала: абезкрываўленая жывёліна прадаўжае жыць і жыць досыць доўга (жаба жыве, напрыклад, трое сутак). А гэта дае магчымасьць, прыбаўляючы да пажыўной жыжы тую ці іншую колькасьць атруты, наглядаць уплыў яе на органы дасьледваемай жывёліны.

Завод пад шклом

У цэлым шэрагу вытворчасьцяў—у фарбавальнях і сушылках, у гарачых цэхах тэкстыльнай вытворчасьці, у горнах фарфора—фаянсавых фабрык, на мэталёапрацоўчых заводах—пануе выключна высокая тэмпэратура), даходзячая часам да 70—100 градусаў. І да гэтага часу ні ў нас, ні за межамі, ніхто ня ведае як уплывае гэтая тэмпэратура на організм рабочага, як захаваць яго ад гэтага ўплыву і зрабіць працу ў гарачых цэхах ня шкоднай і здаровай.

Да вырашэньня гэтага пытаньня Інстытут падышоў таксама орыгінальна. Па сярэдзіне адной з сваіх лябораторый з тоўстага шкла пабудавана зачыненая з усіх бакоў камэра, абыймаю ў 42 кубічных мэтры. Па жаданьню загадчыка лябораторыяй, дзякуючы цэлай сыстэме складаных прыладаў, гэтая камэра можа зьмяняцца па сваіх унутраных атмосфэрных умовах то ў горан фарфора—фаянсавых фабрык з яго 90 градуснай тэмпэратурай, то ў сушылку тэкстыльнай фабрыкі з 45 градуснай тэмпэратурай і вільготнай паветрай, то у любы гарачы цэх любога прадпрыемства. І вось тут-та, у гэтых штучна створаных умовах і робяць дасьледваньні на жывым чалавеку.

Цяжка ня спужацца надворнага выгляду таго чалавека, якога для дасьледваньня ўвозяць у камэру. Яго ноздры сьціснуты асобнымі цiскамі, каб ён дыхаў толькі ротам. У рот устаўлена тоўстая труба, якая, як гадзіна, вігынаецца па падлозе камэры і зьнікае ў маленькай адтуліне ў тоўстай шкляной сьцяне. Голая труба абкружана гутаперчавай вяроўкай, а на голай руцэ адзета гумавая манжэтка. І усё гэта гнуткімі трубкамі злучана са складнымі прыладамі, якія стаяць па-за камэры. Седзячы каля іх лябарант па цыфэрблятам прыладаў, па яго тэрмомэтрам і шчотчыкам у кожнаю хвіліну ведае, як працуюць органы дасьледваемага чалавека.



Так дасьледуе Інстытут уплыў высокай тэмпэратуры ў вытворчасьці на здароўе чалавека.

Навуковае „чарадзейства".

У інстытуце ёсьць адна лябораторыя (псыхо-тэхнічная), праца якой амаль чарадзейства. Набудзьце ў гэтай лябораторыі хвілін дзесяць і яна разгадае ваш характар дакладна азначыць, да якой профэсыі вы больш прыгодны. Вось адзін з спосабаў для азначэньня таго, ці можаце вы быць добрым вагонаважатым, шофэрам, машыністым.

Вас саджаюць за стол у асобнай пакоі. Перад вамі на стале маленькі экран і дзьве кнопкі. Дасьледуючы вас работнік лябораторыі знаходзіцца ў суседнім пакоі. На яго стале таксама дзьве кнопкі. Націсьне ён першую—ваш экран асьвеціцца сінім колерам, другую—чырвоным. Ён і праводзіць гэтыя занятки, розна комбінуючы паступовасьць колераў. Ваша-ж задача: угледзяўшы на экране адзін з двух гэтых колераў, націснуць адведную з сваіх двух кнопак. Калі вы націсьнеце правільна, зьявіўшыся колер на экране зараз-жа зьнікае, калі памыліцеся,— ён застанецца. Усе вашы памылкі дасканала і дакладна запісваюцца асобай электрычнай прыладай. Па яго запісам лябарант, дасьледаваўшы вас на шэрагу іншых прыладаў, скажа вам, ці адпавядае вашаму характару тая ці іншая спэцыяльнасьць.

Адзіны ў сьвеце.

Ці ёсьць у нашым інстытуты аховы працы таварышы па рабоце за межамі? Тут можна сьмела адказаць, наш Інстытут **адзіны у сьвеце**. Ды гэта і ня дзіўна. Ці можа капіталістычны Захад сур'ёзна гаварыць аб ахове працы сваіх рабочых, калі аснова яго існаваньня—уціск гэтых рабочых. І ці можа наш Саюз абыйсьціся без такога Інстытуту, калі галоўная наша задача—паляпшэньне ўмоў працы.

Дзяржаўны Інстытут Аховы Працы мог радзіцца, вырасьці і акрэпнуть толькі ў нас, у Савецкім Саюзе, для таго, што ён спачатку да канца—дзеціішча Кастрычнікавай Рэволюцыі.

Мал. Лен.

Абсьледваньне гомельскай організацыі

З 20-га красавіка ў працягу трох тыдняў будзе адбывацца **абсьледваньне Гомельскай організацыі комсамолу.** Пры абсьледваньні будуць выяўляцца, галоўным чынам, наступныя моманты: настаноўка кіраўніцтва, становішча фабрычна-заводзкіх ячэек, культурна-масавая праца, пытаньні нацполітыкі і эконом-працы.

Для абсьледваньня вылучаны т. т. **Пячонка і Джэлюк.**

5-20 мая

ЦК КП(б)Б выдаў дырэктыву ўсім акругкомам і рэдакцыям газэт аб правядзеньні па БССР двухтыднёвіка друку.

Апошні будзе праводзіцца з 5-га па 20 мая з мэтай уцягненьня ў сьвяткаваньне шырокіх мас, правядзеньня шэрагу мерапрыемстваў да популярызацыі друку і ўзмацненьня рабсялькораўскага руху.

На мясцох двухтыднёвік павінен быць адзначаны справаздачнай кампаніяй і перавыбарамі рэдкалегій насьценных газэт, організацыяй рабсялькораўскіх гурткоў і г. д. Пытаньні аб практычных задачах ячэек па кіраўніцтву рабсялькорамі і насьценгазэтамі будуць абгаварвацца на сходах ячэек КПБ і ЛКСМБ.

На ахове працы моладзі.

Нядаўна бюро ЦК ЛКСМБ заслухала даклад камісіі па вучнёўству пры Наркампрацы БССР.

Пасьля абмеркаваньня дакладу бюро адзначыла, што ў выніку працы камісіі вучнёўства распрацаваны і выданы програмы навучаньня па асобным галінам прамысловасьці, выданы пастановы аб разбраніраваньні перарасткаў, аб компэнсацыі майстраў, аб вучнёўстве ў саматужнікаў і рамесьнікаў і г. д.

Адначасова адзначаны наступныя недахопы: недастатковая сувязь камісіі з АК ЛКСМБ; недастатковы кантроль з боку органаў Наркампрацы над выкананьнем выдадзеных камісіяй дырэктыў і програм; слабая зацікаўленасьць працай камісіі з боку гаспадарчых органаў і профсаюзаў.

Антывялікодная буфанада.

Газэтай „Юнгер Арбэйтэр" разгорнута шырокая кампанія супроць сьвяткаваньня вялікадня.

Выдана дармовым дадаткам да газэты антырэлігійная п'еса—буфанада, прызначаная дзеля пастаноўкі драмгурткамі ў рабочых клюбах.

1-е мая ў сталіцы.

Сьвята 1-га мая будзе праводзіцца пад лёзунгамі **міжнароднай пролетарскай салідарнасьці і пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР, выяўленьня братэрскай салідарнасьці з працоўнымі масамі Кітаю і інш. народамі ўсходу, якія змагаюцца за сваё вызваленьне, прыцягненьня ўвагі рабоча-сялянскіх мас да чарговых пытаньняў соцыялістычнага будаўніцтва (зьніжэньне цэн, рацыяналізацыя вытворчасьці, барацьба з бюрократызмам).**

З 25-га па 30-е **красавіка** ў горадзе ў **рабочых клюбах і ў вёсцы** ў нардамох і хатах-чытальнях **організуюцца** вечары з **дакладамі аб 1 маі.**

На апошнім, **перад 1 мая**, партыйным і **комсамольскім дню абгаварваецца** плян сьвяткаваньня.

Для організацыі сьвята **ўтвараецца** на ўсіх прадпрыемствах і пры ўстановах **першамайскай камісіі**, якія працуюць пад агульным кіраўніцтвам культаддзелу ЦСПСБ, пры бліжэйшым удзеле райкомаў і ячэек.

З 15 па 28-е **красавіка** выяжджаюць у вёску шэфы для падрыхтоўкі сьвята і запрашэньня дэлегацый сялян у горад.

Да 1-га мая прыстасоўваецца выпуск школ ліквідацыі няпісьменнасьці, вячэрніх школ рабочай і сялянскай моладзі.

Сьвятам лічыцца 1-е і 2-е мая.

30-га красавіка ўвечары, а 9-й гадзіне наладжваецца факельны паход—карнавал па гораду з кіно-перасоўкамі. У карнавале прыме ўдзел Чырвоная Армія.

А восьмай гадзіне ўвечары 30 красавіка ардынарцы-трубачы, оркестры музыкі аб'яджаюць горад **у** знак пачатку сьвяткаваньня. Даецца агульны аружэйны салют. А 10-й гадзіне ўвечары праз радыё-перадачу на плянцу Волі і Савецкай вуліцы перадаецца прамова Менакругкому КПБ.

1-га мая, у 11 гадзін раніцы на плянцу Парыскай Комуны будзе **парад Чырвонай арміі.** А 12-й гадзіне дню агульна-гарадзкая дэмонстрацыя. З 8 гадзін—сямейныя вечары ў рабочых клюбах.

У вёсцы наладжваюцца сходы сялян і праводзяцца ўрачыстыя пасяджэньні партыйных, профсаюзных, комсамольскіх, грамадзкіх і савецкіх органаў. У дзень 1-га **мая** адбудуцца таксама дэмонстрацыі ў раённых цэнтрах і сямейныя вечары там.

2-га мая—выезд за горад і маёўкі. А 12-й гадзіне ў горадзе—спартыўны прабег і інсцэніроўка **„Дзень 1-га мая ў падпольлі".**

Вечарам у садох і на вуліцах - дармовыя кіно.

У тры радкі.

З 15-га па 25 мая г. г. **піонэрорганізацыя Беларусі сьвяткуе 5-цігадовы юбілей свайго існаваньня.**

○ Наркамзем вызначыў сёлета **землеўпарадкаваць 59773 сялянскіх двары.**

○ У сёлетнім годзе па БССР **налічваецца 248 дашкольных устаноў—дзіцячых** садоў, ачагоў і пляцовак.

○ 700 тысяч руб. адпушчана **на будову цэнтральнага дому селяніна ў Менску.**

○ У летнім сэзоне 1927 году Менск **наведвае для гастроляў Маскоўскі Дзяржаўны цырк.**

Што можа здарыцца ў недалекай будучыне,

калі з бюрократызмам не пакончаць.

1. „Вам, грамадзянін—сказаў бюрократ будучаму грамадзяніну—неабходна атрымаць справку. Інакш нельга даць справе законны ход. За справкай зьвярніцеся да...

Маленькі грамадзянін стаў „зварочвацца".

2. Так адказалі адной... ужо сапраўднаму грамадзяніну: ваша заява з просьбай выдачы справкі ўжо прайшла ўсе інстанцыі. Але на апошнім пасяджэньні ўзьніклі спрэчкі... Пачакайце пакуль мы сьпішымся з зацікаўленымі ўстановамі.

3. „Перапіска з зацікаўленымі ўстановамі" так разгарнулася, што па „справе выдачы справкі" быў організаваны асобны аддзел, а затым і цэлая „ўстанова па выдачы справкі грамадзяніну Х".

4. Ня ведаем, чым-бы гэта ўсё закончылася, калі-б нехта ў самы крытычны момант не даў усім бюрократам па шапцы... Завярцеліся бюрократыкі...

5. І вось урэшце выдалі грамадзяніну Х гэту справку. Але навошта яна яму цяпер?

ЦАНА? ЯКАСЬЦЬ? ВАГА?

Менцэрабкоп правёў цікавае мерапрыемства: нечакана абсьледваў усе магазыны Менску і выявіў шмат цікавых рэчаў адносна цаны, якасьці і вагі тавараў

Гэта цікавае зьявішча, калі звычайная савецкая канцылярыя ператвараецца ў самую простую крамачку.

Вы хочаце ведаць як гэта робіцца?

Сталы, залітыя атрамантамі і змазаныя гумэарабікай, ставяцца ў рад; атрымоўваецца прылавак. Гэты прылавак накрываецца чырвонай матэрыяй, на яе ставяцца вагі, гіры, бутэлькі і інш. дробязь.

Вось і ўсё: **замест оргаддзелу Цэрабкопу, вы маеце гандаль...**

* *

Менцэрабкоп сёньня провоцыруе. Ён рассылае па ўсіх крамах—коопэрацыйных, прыватных, дзяржаўных—людзей. Гэтым людзям даюцца грошы і кошыкі—яны пасылаюцца за пакупкамі. Ім загадваюць — ня выкрываць свайго «інкогніта»: **купіць, заплаціць і пайсьці.**

Людзі бяруць грошы і па двох ідуць. Хто-ж яны, гэтыя «провокатары»?

* *

Гэтага пажылога чалавека я вельмі добра ведаю. Яшчэ-б! Ён, гэты чалавек доктарскага выгляду—служыцель гісталёгічнай лябораторыі. Яго простым начальнікам зьяўляецца профэсар.

Стары Вікенціч паліць печкі, корміць белых пацукоў, узважвае іх; кожную раніцу ён акуратна працірае мікраскопы і мые лябораторную пасуду...

Але Вікенціч, апрача мікраскопаў, клапаціцца яшчэ аб нашай коопэрацыі. **Ён член крамнай камісіі і коопэрацыйнага гуртка.**

У ліку «провокатараў» работніцы-дэлегаткі, рабкоры, комсамольцы, члены крамных камісій і інш.

* *

Менцэрабкопу трэба выявіць, **як адносяцца да пайшчыка. Якія існуюць цэны? Якая якасьць тавару? Вага?**

Чалавек, пасланы за пакупкамі, звароччваецца. Яго адразу вядуць да вагаў. Куплены тавар пераважваецца. Прадстаўнік акргандлю тав. **Гатман** сваю справу добра ведае. Ён былы прыкашчык і калі ён пералівае з аднэй бутэлькі ў другую алей—кропля не ўпадзе на падлогу. Галоўны «крамнік» тав. **Ізакаў**—загадчык гандлёвага аддзелу Цэрабкопу. Цяпер ён арудуе з гірамі.

Правяраюць якасьць тавараў: нюхаюць, усунуўшы нос у крупу, бяруць муку на язык, змочваюць яе сьлюной, прабуюць на зуб, глядзяць на сьвет. Мацаюць і ня вераць на **слова**. Ня вераць...

* *

Што-ж выяўлена?

Цэны як правіла—цэны ў Цэрабкопе ніжэй, чым усюды.

Ваціцкі шаўровыя жаночыя каштуюць у Цэрабкопе **17 р.**, у «Чырвоным Крыжу» —**20 руб. з капейкамі.** Алей у Цэрабкопе—**53 к. кілё**, у прыватніка—**70-80 кап.** Селядцы ў Цэрабкопе таней чым у прыватніка на **50-60 проц.**

За тое кілё сала каштуе ў прыватніка—**115-120 кап.**, у ЦРК—**1 р. 30 к.**

Махорка. Яна каштуе зараз **6 кап. пачка.** Але адзін з магазынаў ЦРК не пасароміўся запрасіць—**7 кап.**

Усё-ж агульнае ўражаньне, што **прыватнік дзярэ колькі ўздумаецца.**

Якасьць. У агульным і цэлым усюды здавальняючая. Але... рыс у коопэрацыі падазронай якасьці—**тухлы пах.** Прадстаўнік акргандлю зацікавіўся гэтай справай і паслаў рыс для аналізу ў хлебную інспэкцыю.

Крыху дзіўна атрымоўваецца са сьлівачным маслам. Коопэрацыя прадае яго па **2 р. 60 к. за кілё,** прыватнік па **2 р. 25 к.** Пытаньне аб якасьці гэтымі днямі выявіць Пастэраўскі Інстытут, куды гэтае масла паслана на дасьледваньне.

Вага. Прыватнік у агульным і цэлым дае добрую вагу. Коопэрацыя дае **лішні «паход».** Некаторыя крамы даюць на кілё па 40 грамаў лішку. Ва ўсякім разе перавес на 10-20 грамаў звычайнае для коопэратыву зьявішча.

* *

. Па двох уходзяць «провокатары». Ля прылаўка шум і крыкі. Нюхаюць, мацаюць, важуць і пераважваюць..

— Галоўнае—гандлюйцеся—раяць уходзячым.

«Провокацыя» у разгары.

Гр.

Без цыркуляру нічога ня робяць.

Наркамгандль выявіў, што **гандлёвыя організацыі ў большасьці выпадку пасыўна адносяцца да кампаніі па зьніжэньню цэн і бяз цыркуляру Наркамгандлю нічога не прадпрымаюць.**

Нядаўна прадстаўнікі Наркамгандлю і Менскай Акруговай Кантрольнай Камісіі выяжджалі ў сельскія мясцовасьці з мэтай абсьледаваньня працы па зьніжэньню цэн.

Абсьледваньне выявіла шэраг выпадкаў, калі гандлёвыя організацыі нават правышаюць устаноўленыя Наркамгандлем гранічныя цэны.

Гандлюючыя організацыі недастатковa высьвятляюць у друку становішча і дынаміку цэн, іх зьніжэньне і г. д., з прычыны чаго **масавы спажывец пазбаўлен магчымасьці кантраляваць зьніжэньне цэн.**

З усяго гэтага Наркамгандль БССР робіць наступныя вывады:

Кампанія па зьніжэньню цэн праходзіць не інтэнсыўна. Часта гандлёвыя організацыі ў пагоне за большым прыбыткам недастаткова прымаюць меры да зьніжэньня цэн.

Недастаткова інтэнсыўна праходзіць зьніжэньне адпускных цэн па лініі прамысловасьці ВСНГ.

— Некаторыя гандлюючыя організацыі, у прыватнасьці на вёсцы, не выпаўняюць устаноўленых цэн і накідак, правышаючы апошнія.

Неабходна ў большай меры завастрыць увагу ўсіх савецкіх і грамадзкіх організацый на ўстанаўленьні кантролю над гандлюючымі організацыямі ў сельскіх мясцовасьцях.

Практычна Наркамгандаль лічыць неабходным правесьці ў бліжэйшы час наступныя мерапрыемствы:

З 15-га красавіка па 15 мая організаваць масавае абсьледаваньне гандлёвых організацый у сельскіх мясцовасьцях, дзеля чаго прывабіць увесь коопэратыўны інструктарскі апарат. Акркамунутгандлі, адказных акруговых працаўнікоў і пры іх удзеле праверыць ня менш 50 проц. спажывецкіх таварыстваў. Астатнія сельскія гандлёвыя організацыі павінны ў месячны тэрмін даць справаздачу райвыканкому аб праробленай імі працы па зьніжэньні цэн.

На клюбнай сцэне.

„Пінская Мадонна".

(Пастаноўка ў клюбе КІМ).

Перад напоўненай комсамольцамі залай праходзіць п'еса Галубка «Пінская Мадонна».

Стары час... Глухі куток піншчыны... Касьцёл... Ля касьцёлу, як і заўсёды, сядзяць кучкамі калекі, старцы, лірнікі.

... Сумна гудзе ліра. Над яе сукі даюць старцам людзі капейкі.

Ад такіх старцаў багамольцаў малыя заработкі касьцёлу; патрэбен выхад...

Разьнясьліся чуткі, што зьявіўся вобраз «маткі боскай». Прэ да касьцёлу народ валам. Шум, гам, даўка ля касьцёлу. Стражнік ведае тут сваю справу. Выпіўшы «чыстай вадзіцы» ён крычыць: «асадзі назад».

... Ксёндз і пан Пуховіч лічаць здабыткі ад «спраў сьвятых»—здабыткі важныя. Ксяндза і пана справы пашлі ў гору. У іх «адбуджаецца маладосьць». Явы заводзяць справы з палюбоўніцай.

Крадучыся адзін ад аднаго ходзяць ксёндз і пан да простытуткі Дзіаны.

Грошы, ахвяраваныя на «сьвятыя справы», пераходзяць па троху к простытуткі.

Не зявае і «бедны яўрэй» Хацкін. Ён кажа: «што па пляну, то пану, а што не па пляну, то мне». У яго клапоты. Строіць ён карчму для багамольцаў. А людзі ідуць і вераць у «цудоўную матку боску». Грошы плывуць... Будуецца лепшы касьцёл.

Прыехаўшы мастак малюе абразы. Мастак па словах ксяндза чалавек ня чэсны, палітычны, прысланы з цэнтру...

А вось са стражнікам Гаўрылам сядзіць «аўтар спраў сіх сьвятых, раб божы інак вольны, птушка нябесная», прашоўшы «царства нябеснае» і зямное. Ён павесіў «цудоўны абраз» у лесе. Народ паверыў гэтаму «цуду». Цяпер «інак раб божы» запівае з стражнікам «дзела сваі праведныя», і забіраецца ў новыя месцы праслаўныя «для дел своих».

Мастак ужо канчае размалёўку касьцёла.

Ён малюе «матку боску» з портрэту простытуткі Дзіаны.

Абгляд касьцёлу. Народ лезе пішчом у касьцёл. Абглядаюць. Ксёндз і пан пазнаюць «матку боску». Крык, гам. Ксёндз з панамі другімі бягуць з касьцела. Прыбягае прыстаў са стражнікам. Стражнік бяжыць за мастаком, які хацеў расказаць «гэтыя справы» народу. Народ схамянуўся. Прыстаў замахнуўся на народ бізуном. Маўчы! крычыць ён і паказвае бізуном на «цудоўную ікону». «Рабы божыя» падаюць на калені і моляцца «матцы боскай» і прыставу з бізуном.

У п'есе выведзены добра тыпы: Хацкін—«яўрэй і «школьнік», сын пана Пуховіча. Паказан тып брадзягі «інака». Іх шмат было і ёсьць яшчэ такія прыкрываючыя сябе «словамі і дзелам божым».

Забітыя і цёмныя постаці стражнікаў знаючых свае «каб і мух ня было бяз пашпарту». Артысты добра ігралі. У п'есе досыць комізму. Ёсьць дзе-ні-дзе месца і цяжкіх сцэн, як «жарты» ксяндза і пана з палюбоўніцай. Агулам п'еса добрая.

У выкананьні трупы Галубка, яна будзе карыстацца ў мястэчках і вёсках з посьпехам. Комсамольцы, глядзячы гэтую п'есу, былі зацікаўлены. Трэба сказаць, што разгарнуцца п'есе перашкаджала малая сцэна, але гэта не перашкаджае вітаць клюб КІМ'у за тое, што ён дае магчымасьць глядзець комсамольцам такія п'есы.

І. Дуброўскі.

І усё з-за „Чырвонай Зьмены".

(Водгук на фэльетон «Караблі у краіну комсамольскай зыкі»).

Якая справа «Чырвонай Зьмене», што якіясьці два комсамольцы з агульна-адукацыйных курсаў п'юць, хуліганяць, гуляюць у карты, няцікавяцца грамадзкай працай?

А яна тут як тут! Узяла ды зьмясьціла фэльетон, ды яшчэ на першай старонцы... Шмат нарабіла лішніх клапот...

* *

Цэлы тыдзень толькі і чуць было:

— Чытаў?

— Як табе гэта падабаецца? Ну і «Зьмена»! Калі бюро?

— Адчыненае ці зачыненае?

— Ды я 9 кап. за «Зьмену» заплаціў газэтчыку. Ці гэта зьніжэньне цэн? У Наркамгандаль трэба жаліцца, што «Зьмена» другіх лае, а сама наадварот цэны павышае... — Жартуюць хлопцы.

У гэты тыдзень самым аўторытэтным чалавекам на курсах была—«Зьмена».

Гэты тыдзень для слухачоў цягнуўся доўга, бы ліпкая нітка мёду. Урэшце доўгачаканы панядзелак. Калі ўжо будзе 10 гадзін?

Так адчувалі сябе ўсе да аднаго комсамольцы, і нават беспартыйныя слухачы курсаў.

На бюро сядзелі доўга—да 2-х гадзін ночы. І ўсё з-за «Зьмены»... Усе яе заявы зробленыя перад усім комсамолам Беларусі прышлося прызнаць правільнымі. І двум слухачам-комсамольцам уляцела...

Чэшку—выгавар з папярэджаньнем, працягнуць кандыдацкі стаж.

Падносу—выгавар.

Абоіх зьняць з грамадзкай працы.

І ўсё гэта за тое, што «Зьмена» умешваецца ва унутраныя справы...

Мы застаемся з поўнай надзеяй, што хлапцы справяцца, стануць добрымі комсамольцамі, якімі яны былі паўгода таму назад. Комсамольскі кацел іх пераварыць.

Як. Шур.

У нядзелю 17-га красавіка,

у Доме Асьветы,

а 1-ай гадзіне днём, рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена» сумесна з АК ЛКСМБ і Менскім Акруговым Саветам Шэфтаварыства пад весна...

склікае нараду па пытаньню аб працы юнсэкцый шэфтаварыстве

На нараду запрашаюцца працаўнікі юнсэкцый шэфтаварыстваў, сакратары і АПОргі комсамольскіх ячэек.

НА ПАРАДКУ ДНЮ:

1. Інфармацыя Бюро юнсэкцый раённых шэфтаварыстваў аб сваёй працы.
2. Аб задачах працы юнсэкцый шэфтаварыстваў.

Апошнія спэктаклі для моладзі

Рэдакцыя «**Чырвонай Зьмены**» сумесна з цэнтральным клюбам імя «КІМ» па згодзе з дырэкцыяй БДТ організуе апошнія ў гэтым сэзоне агульна-даступныя спэктаклі для рабочай, служачай і вучнёўскай моладзі Менску.

Абвешчаны ў папярэдніх нумарох нашай газэты **парадак** спэктакляў крыху зьмяняецца.

Спэктаклі будуць наступныя:

У суботу 23-га красавіка — «Над Нёмнам».

У сераду 4-га мая — «Каваль Ваявода».

У аўторак 10-га мая — Дыспут аб пастаноўках і концэрт.

У пятніцу 13-га мая — «Мешчанін у шляхецтве».

Білеты на спэктаклі прадаюцца ў рэдакцыі газэты «**Чырвоная Зьмена**» (Комсамольская, 25), а па вечарох—у клюбе «КІМ».

Уваход на дыспут — **дармовы** па асобным білетам.

Адказы чытачам.

Левікаву (№ 905). Часопісь «Наш Край» выходзіць адзін раз у месяц. Адрас рэдакцыі: Менск, Рэволюцыйная 21, Інбелкульт, ЦБ краязнаўства, рэдакцыя часопісі «Наш Край».

Шышко (№ 906). У Ленінградзе ёсьць фотокінотэхнікум, таксама ў Маскве ёсьць Дзяржаўны тэхнікум кінематографіі. Можна паступіць у гэтыя навучальныя установы на агульных умовах.

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867, Менск, 2 друкарня БДВ.